ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

ЛІПЕНЬ 27 1933 г. ЧАЦЬВЕР № 171.

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АБ ПЛЯНЕ АЗІМАЙ СЯЎБЫ НА 1933 г. 3 пастановы СНК СССР. (2 стар).

АБ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАМЫЛКАХ БЮРО ПАРТ'ЯЧЭЕК ВОДНАГА ТРАНСПАРТУ І ФАБРЫКІ ІМЯ ЛЕКЕРТА. Пастанова бюро гаркому КП(б)Б ад 26 ліпеня 1933 г. (1 стар).

АРТЫКУЛЫ:—II зьезд партыі і арганізацыя партыі новага тыпу (3 «Правды»—2 стар.). П. Г. КУБЕЛЬ (рабочы ф. „С. І." і Б. Л. Мэерзон («Віцебскі пралетары»)—Алілюйшчыну, парадную шуміху—характэрную для ўсёй работы зьнятага кіраўніцтва гарсавету, заменім завастраньнем бальшавіцкай прынцыповасьці, канкрэтным асабрацыйным кіраўніцтвам, веданьнем людзей, цясьнейшай сувязьзю з рабочымі масамі (3 стар.). БАРАНОЎСКАЯ, ДАВІДАВА, КАНАПЛЁВА Е (рабочыя акулярнай фабрыкі) і САКАЛОЎСКІ І ІВАНОЎСКІ (рабочыя каапгасу «Новы сьвет»)—Ад чорнай дошкі да чырвонага сьцягу. (4 стар).

ЗА ЖАЛЕЗНУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ КОЖНАГА ЗЬВЯНА ВІЦЕБСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ (2 стар.).

МАБІЛІЗАЦЫЯ „75"—АДНА З ВАЖНЕЙШЫХ ПАЛІТЫЧНЫХ ЗАДАЧ. Дырэктыва пленума гаркому і гарКК павінна быць выканана (2 стар).

Уборачнай і збожжава. ўкам—моцнага каня! (1 стар.).

ПЛЕНУМ ГАРСАВЕТУ СУСТРЭЦЬ ПОЎНЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ ПЛЯНУ СЕНАЗАГАТОВАК (1 стар.)

ЗА МЯЖОЙ: Бі жавая паніка ў ПАЗШ пашыраецца (4 стар.).

Аб палітычных памылках бюро парт'ячэек воднага транспарту і фабрыкі імя Лекерта.

Пастанова Віцебскага гаркому КП(б)Б ад 26 ліпеня 1933 г.

Побач з магутным уздымам актыўнасьці, які выклікала ў шэрагу асноўных партыйных калектываў фабрык і прадпрыемстваў прапрацоўка пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб віцебскай арганізацыі, асобныя партыйныя ячэйкі не зрабілі з усёй рашучасьцю для сябе вываду з прамых указаньняў абʼяднанага пленуму гаркому і гарКК аб тым, што: «Пленум з усёй катэгарычнасьцю абавязвае партыйныя ячэйкі своечасова даваць самы рашучы адпор і прасякаць у корані спробы з боку асобных, зьвязаных кругавой парукай і сямейнасьцю, адарваўшыхся ад мас камуністаў, падмяніць славесную дэкларацыйнасьцю і алілюйшчынай сапраўдную баявую мабілізацыю мас на ажыцьцяўленьне неадкладнай і крутой перабудовы ўсёй работы партыйнай арганізацыі ў напрамку ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б», указаньняў пленуму аб тым, што прапрацоўка пастаноў павінна праходзіць «пад адзнакай самага шырокага разгортваньня зьнізу да верху пралетарскай самакрытыкі, падвышэньня клясава-палітычнай пільнасьці кожнага камуніста і яго авангардная роля на прадпрыемстве і ў сельскай гаспадарцы, выяўленьня і выкрыцьця па імёнах і прозьвішчах канкрэтных носьбітаў маючайся ў асобных зьвеньнях партарганізацыі сямейнасьці, групаўшчыны, саноўна-барскіх адносін да работы, пад адзнакай выяўленьня буржуазных перараджэнцаў, бюракратаў, маскуючыхся клясавых ворагаў, выганяючы іх з радоў партыі».

У выніку адсутнасьці дастатковай папярэдняй масавай падрыхтоўкі і наяўнасьці вазённа-фармальных адносін да такога выключна важнага пытаньня, як прапрацоўка пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б —гэтая прапрацоўка ў ячэйках воднага транспарту і фабрыкі імя Лекерта была палітычна змазана, прайшла ў значнай ступені фармальна, ня выклікаўшы шырока разгорнутай крытыкі і самакрытыкі тых буйнейшых недахопаў, якія маюцца як у рабоце воднага транспарту, гэтак і фабрыкі імя Лекерта.

Неасрэдную адказнасьць за змазваньне прапрацоўкі пастаноў ЦК у гэтых ячэйках нясуць у першую чаргу бюро партыйнай ячэйкі воднікаў (сэкратар тав. Агеева) і бюро ячэйкі фабрыкі імя Лекерта (сэкратар тав. Левін), а таксама дакладчыкі тт. Дуброў і Рэбікель, якія замест завостранай палітычнай пастаноўкі дакладу і забесьпячэньня разам з бюро ячэйкі, папярэдняй масавай падрыхтоўкі да сходаў—падышлі фармальна і дзіляцкі да выкананьня адказьнейшага даручэньня ГК, што ў прыватнасьці досыць яскрава праявілася ў факце адмаўленьня гэтых двух дакладчыкаў ад заключных слоў пасьля спрэчак па іх дакладах, нягледзячы на тое, што зьмест спрэчак бязумоўна патрабаваў апошнікі ў заключным слове.

Гарком КП(б)Б пастанаўляе:

1. Лічыць неабходным правесьці паўторную прапрацоўку пастановы ЦК ў ячэйках воднікаў і фабрыкі імя Лекерта. вылучыўшы ў якасьці дакладчыкаў членаў бюро ГК КП(б)Б тт. Башмачнікава і Зіноўева.

2. Сэкратару партыйнай ячэйкі фабрыкі імя Лекерта тав. Левіну абвясьціць вымову. Папярэдзіць тав. Левіна, што адсутнасьць у бліжэйшы час рашучага пералому ў пастаноўцы партыйнай работы на фабрыцы пацягне за сабою самыя жорсткія меры партыйнага спагнаньня

3. Сэкратара партыйнай ячэйкі воднікаў т. Агееву з работы сэкратара ячэйкі зьняць і абвясьціць вымову.

4 Тт. Дуброву і Рэбікель за фармальна-казённыя адносіны да адказьнейшага партыйнага даручэньня—абвясьціць суровую вымову. Папярэдзіць гэтых таварышоў, што пры паўтарэньні факту гэткіх безадказных адносін да партыйных даручэньняў, яны будуць выключаны з радоў партыі.

5. Даручыць т. Башмачнікаву 28 ліпеня правесьці агульнагарадзкую нараду сэкратароў партʼячэек і дакладчыкаў для прапрацоўкі гэтай пастановы ГК.

6 На наступным пасяджэньні бюро падвесьці вынікі прапрацоўкі ў віцебскай арганізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

7. Лічыць неабходным выезд членаў бюро ГК і актыву ў сельсаветы для забесьпячэньня безадкладнай прапрацоўкі пастаноў ЦК у вясковай частцы партарганізацыі, праводзячы абгаварэньне пад адзнакай мабілізацыі мас на поўнае выкананьне сеназагатовак у бліжэйшы дзень—два, на своечасовае і высокаякаснае правядзеньне ўборкі і забесьпячэньне першачарговага, датэрміновага выкананьня пляну здачы сельгаспрадукцыі дзяржаве.

Даручыць т. Башмачнікаву ў аднадзённы тэрмін забясьпечыць выезд дакладчыкаў у вясковыя ячэйкі.

Сэкратар Віцебскага гаркому КП(б)Б
І. Жураўлёў

ВЫТРЫМАЦЬ БАЯВЫ ЭКЗАМЭН

Уборачнай і збожжапастаўчай кампаніям—моцнага каня!

Бязьлітасна караць кулацкіх драпежнікаў конскага пагалоўя.

КАНЮ—ВЫКЛЮЧНУЮ ЎВАГУ!

У пачаўшайся ўборцы і падыходзячай збожжапастаўчай кампаніі, конь будзе адыгрываць выключна вялікую ролю.

Сьцісляя, ушчыльнёныя тэрміны ўборкі і паралельная з уборкай здача збожжа дзяржаве патрабуюць самага рацыянальнага скарыстаньня ўсіх працаздольных коняй. Конь зьяўляецца ў нашых умовах асноўнай сілай па транспартаваньні збожжа з поля да малатарань і з малатарань на ссыпныя пункты Загатзярна.

У радзе калгасаў гэтага ўпарта не жадаюць разумець. Як і раней каню няма ўвагі, ён бяспрытульны Толькі поўнай бястурботнасьцю, стратай палітычнай пільнасьці кіраўнікамі калгасаў можна тлумачыць поўнае арудаваньне клясавага ворага, па-драпежніцку зьнішчаючага конское пагалоўе ў калгасах: «Малая Чэрніца»,. Замастоцкага сельсавета, імя Чарвякова, Рудакоўскага сельсавету.

Дабіцца такога догляду і такіх беражлівых і чулых адносін да каня, як у калгасах «Зьвязда», Сялюцкага сельсавету і імя Сталіна, Машканскага сельсавету,—вось задача, якая стаіць перад усімі саўгасамі і калгасамі.

Каню—больш увагі, больш клопатаў, як гэтага патрабуюць пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР. Вышэй клясавую пільнасьць, бязьлітасна выкрываць і сурова караць клясавага ворага, які будзе працягваць сваю брудную лапу да саўгасна-калгаснага каня.

Па-драпежніцку адносяцца да каня.

Дырэктыва партыі і ўраду гаворыць аб беражлівых адносінах да каня. Але гэтага ня хочуць зразумець у калгасе імя Чарвякова, Рудакоўскага сельсавету.

У брыгадзе № 2 (брыгадзір Салаўёў) 20 коняй пасуцца на маленькім кавалку пашы. Тое ж самае і ў брыгадзе № 1 (брыгадзір Батанаў).

Нагледаюць за конямі людзі, як Ложачкін Тарас, Ложачкін Мікола, якія нядбайна адносяцца да выкананьня сваіх абавязкаў. Замест таго, каб лепш пасьвіць коняй, яны цэлымі днямі сьпяць на пасьбішчах.

На гэтыя злачынныя адносіны да каня, праўленьне калгасу (старшыня Зайцаў) заплюшчыла вочы. У выніку такой безадказнасьці коні зараз выглядаюць яшчэ горш, чым у час весьнавой саўбы. Яны галодны, замораны, днямі ня поюцца, іх апанавалі вошы. Маюцца выпадкі падзяжу.

Праўленьне калгасу і брыгадзіры, віноватыя ў драпежніцкіх адносінах да каня, павінны быць прыцягнуты да суровай судовай адказнасьці.

Калгасьнікі: Рунько, Самцоў.

Выканаць цалкам плян злучной кампаніі.

На пляне на 15 ліпеня ў калгасах павінна была быць праведзены злучкі 1.663 каняматак, а злучана толькі 1.125, што складае 67,7 проц. Па саўгасах з 200 каняматак злучана 189, альбо 94 проц. і па аднасобным сэктары з 945—злучана толькі 77, альбо 8,9 проц.

У калгасах раду сельскіх саветаў —Рудакоўскі (старшыня Кэрбэль), Бараўлянскі (старшыня Куракоў), Даўжанскі (старшыня Піскуноў) і Шумнянскі (старшыня Хаміч)—на 15 ліпеня (апошні тэрмін злучкі) не пакрыта і паловы каняматак.

Мы маем цэлы рад выпадкаў проста злачынных, шкодных адносін да злучнай кампаніі і разьвіцьця конскага пагалоўя ў раёне.

У калгасе „Скрыдлева", Замастоцкага сельсавету, з 28 кабыліц на 5 ліпеня не пакрыта ніводнай. Старшыня калгасу Баклапаў злачынна аднёсься да справы разьвіцьця конскага пагалоўя.

На такім жа шляху пашлі і рад калгасаў іншых сельсаветаў (калгас „В. Чэрніца", Замастоцкага сельсавету,—старшыня Медчанка, калгас „Новае жыцьцё", Рудніцкага сельсавету,—старшыня Андрэеў).

Гарземаддзелу трэба прыняць самыя суровыя меры да зрыўшчыкаў выкананьня важнейшых дырэктыў ураду і партыі аб злучной кампаніі.

Лепшы прыклад догляду, зьберажэньня і правядзеньня злучнай кампаніі паказаў калгас «Зьвязда», Сялюцкага сельсавету, (старшыня Нікалаеў), імя Сталіна, Машканскага сельсавету (старшыня Садавы).

Плян злучной кампаніі ў апошнім, дзякуючы добраму догляду кабыліц, перавыкананы. Па пляне трэба злучыць 25, а злучана 31 кабыліцу.

Пастановай Наркамзема СССР конская злучная кампанія працягнута да 1 жніўня. Сельскія саветы, сельсаветы і калгасныя партыйныя ячэйкі, праўленьні калгасаў і ўпаўнаважаныя па вёсках павінны скарыстаць застаўшыяся лічаныя дні для таго, каб цалкам выканаць раённы плян злучкі, навярстаўшы ўпушчанае, зрабіць яшчэ адзін крок уперад у справе разьвіцьця нашага сацыялістычнага конскага пагалоўя.

Вэтінспэктар Н.

Шкоднікі—арудуюць, а праўленьне... сьпіць.

Неаднаразова насьцягазэта калгасу «Малая Чэрніца», Замастоцкага сельсавету, сыгналізавала аб тым, што да конскага пагалоўя адносяцца дрэнна. Вось рад фактаў агіднейшых адносін да каня. Забяленазікаў Васіль за дзень змулаў каню плечы і на ім-жа працаваў на сваім гародзе да поўнасьці. Конь асьлеп. Хамцоў Нічыпар таксама не падабраў хамута да каня і сьцёр яму плечы. Лазарэнка Андрэй быў пасланы да ветурача лячыць хворага каня, але замест урача заехаў у госьці і там прагінствазаў цэлую ноч, а конь галодны прастаяў на дварэ.

У калгасе згінула тры кані, зьвергла 5 матак, 6 гадавых жарабят, і ўсё па віне шкодніка Ганчарова Кірылы.

Старшыня калгасу Пласкуноў страціў клясавую пільнасьць, прымірыўся з дзейнасьцю клясавага ворага. У гэтую справу неадкладна павінна ўмяшацца пракуратура.

Воранаў.

Пленум гарсавету сустрэць поўным выкананьнем пляну сеназагатовак.

ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ КІРАЎНІКОЎ СТАРАСЕЛЬСКАГА, БАРАЎЛЯНСКАГА І РУДНІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТАЎ, ЯКІЯ ПАТУРАЮЦЬ КУЛАЦКАМУ САБАТАЖУ.

У АДЗНАКУ ПЛЕНУМА КАЛГАСЫ ЗАКАНЧВАЮЦЬ СЕНАЗАГАТОЎКІ.

Гэтымі днямі адбыўся пленум В.-Лётчанскага сельсавету па пытаньню падрыхтоўкі да пленума гарсавету і вылучэньня дэлегата на ўсебеларускі зьезд перадавых старшынь сельсаветаў. Пленум прайшоў пад знакам узьняцьця тэмпаў па сеназагатоўках. 24 ліпеня калгасы «Культурны фронт», «Віцебскі пралетары» поўнасьцю выканалі свой плян на сеназагатоўках згодна дагавору па кантрактацыі. Заканчваюць сеназагатоўкі калгас імя Молатава і вёска Кузьняцова. Паміж калгасамі заключаны сацдагавары на хутчэйшае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай на хутчэйшую ўборку бяз страт.

На зьезд перадавых сельсаветаў абран старшыня сельсавету т. Когаль.

Б.

АРГАНІЗУЕМ АГУЛЬНА-СЕЛЬСАВЕЦКІ ЧЫРВОНЫ АБОЗ З СЕНАМ ІМЯ ПЛЕНУМА ГАРСАВЕТУ.

Рудніцкі сельсавет па баявому разгорнуў падрыхтоўку да пленума гарсавету. Уся падрыхтоўчая работа ідзе пад лёзунгам выкананьня семядачы дзяржаве. 23 ліпеня калгасы імя Войкава, імя Ланцуцкага, «Бальшавік», імя Дзяржынскага поўнасьцю выканалі абавязкі перад дзяржавай па сеназагатоўках згодна кантрактацыйных дагавароў.

Гэтымі днямі адбыўся пленум сельсавету, на якім было абгавораннае пытаньне аб ходзе сеназагатовак па аднаасобным сэктары. 23 ліпеня пункт Аржалоўскі (член сельсавета Нікіцін), пункт Хадулоўскі (член сельсавета Гарбачэўскі), вёска Макараўка (член сельсавета Пржавальскі), вёска Паўлаўшчына і Антонмаўскі пункт — арганізавалі чырвоны абоз, якім здадзена 3 520 кг. сена. Пленум сельсавета пастанавіў 28 ліпеня арганізаваць агульна-сельсавецкі абоз з сенам імя пленума гарсавету.

Каваленка.

ХОД СЕНАЗАГАТОВАК ПА РАЁНЕ НА 25 ЛІПЕНЯ (у цэнтнерах).

Сэктары	План	Вык.	Проц.
Калгасы .	6326	3366	53,2
Аднаасоб. .	7269	1443	19,8
Цьвёрдазад	1257	88	7
Разам . .	14852	4897	32,9

***

Надрукаваная зводка ходу сеназагатовак па кантрактацыйных дагаварох на 25 ліпеня гаворыць аб ЯЎНА-ПАГРАЖАЮЧЫМ СТАНОВІШЧЫ на гэтым важнейшым вучастку.

Як відаць са зводкі, АСАБЛІВА АДСТАЕ АДНААСОБНЫ СЭКТАР, які павінен згодна кантрактацыйных дагавароў здаць 8 526 цэнтнераў сена, г. зн. 65 процантаў усяго раённага пляну.

Між тым аднаасобнікі (уключаючы і цьвёрдазаданьнікаў) здалі толькі 1.443 цэнтнера (17 проц) сена

Зусім недапушчальнае, прамое патураньне кулацкаму сабатажу з боку сельсаветаў: СТАРАСЕЛЬСКАГА (старшыня сельсавету АРЖАНОЎСКІ, сэкратар парт'ячэйкі САЛАМОНІК), БАРАЎЛЯНСКАГА (старшыня сельсавету КУРАКОЎ, сэкратар парт'ячэйкі ШВОРАЎ), РУДНІЦКАГА (старшыня сельсавету ІВАНОЎ, сэкратар парт'ячэйкі КАВАЛЕНКА), дзе цьвёрдазаданьнікі ня здалі дзяржаве ніводнага цэнтнера сена.

Ганебнае адставаньне сеназагатовак павінна быць неадкладна ліквідавана. Трэба з усёй сілай выкрыць і ўдарыць па канкрэтных носьбітах апартуністычнага самацёку, патуральніках кулацкаму сабатажу. Разгарнуўшы шырокую масавую работу, сельсаветы павінны да 28 ліпеня—дня пленуму гарсавета — забясьпечыць поўнае выкананьне сеназагатовак.

Гэта будзе зьяўляцца першым экзэменам для ўсіх арганізацый Віцебшчыны ў справе перабудовы работы на аснове пастановы ЦК КП(б)Б „Аб віцебскай партарганізацыі", будзе зьяўляцца бальшавіцкім разгонам да пасьпяховай уборкі і збожжапастаўчай кампаніі.

РАЗГАРНУЦЬ МІЖКАЛГАСНУЮ ЎЗАЕМАДАПАМОГУ.

22 ліпеня адбыўся пашыраны пленум Шумнянскага сельсавету, на якім абгаварвалася пытаньне аб падрыхтоўцы да пленуму гарсавету.

У адзнаку адкрыцьця пленума гарсавету ўсе старшыні калгасаў і члены сельсавету ўзялі на сабе абавязак да 28 ліпеня выканаць плян сеназагатовак па кантрактацыйных дагаварох. Арганізуецца між калгасная ўзаемадапамога па дастаўцы сена на загатоўчыя пункты. Калгасы «Новы сьвет» і імя Молатава дапамагаюць калгасу «Камінтэрн», а калгас імя Будзёнага — калгасу «Парыская камуна».

Севасьцеенка.

ДА 28 ЛІПЕНЯ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ АБАВЯЗКІ ПА ЗДАЧЫ СЕНА ПА КАНТРАКТАЦЫЙНЫХ ДАГАВАРОХ.

Толькі адзін калгас імя Чырвонай арміі па Ялагінскім сельсавеце выканаў свой плян па сеназагатоўках. Астатнія калгасы («Чырвоны ўдарнік», імя Гамарніка) адстаюць

Пленум сельсавету, які ўчора адбыўся, абавязаў усіх старшынь калгасаў і членаў сельсавету да 28 ліпеня выканаць плян сеназагатовак. 24 ліпеня прыбылі абозы аднаасобнага сэктару, якімі здадзена 24,85 ц. сена.

АГЭЛЬ.

Касіць так, як Крыцкі Ляксей і Балашоў Андрэй!

Усе сілы—на неадкладнае завяршэньне сенаўборкі.

Добрая арганізацыя працы забясьпечыла перамогу.

Калгас „Зорка", Бараўлянскага сельсавету, 21 ліпеня скончыў цалкам сенаўборку.

Нягледзячы на значны недахоп касцоў, калгас скончыў сёнаўборку амаль своечасова дзякуючы высокай прадукцыйнасьці працы на касьбе. Калгасьнікі Крыцкі Ляксей і Балашоў Андрэй выкашвалі да 1 га ў дзень кожны і навет больш. Ва ўборцы сена і сушцы яго ўдзельнічалі ўсе жанчыны, якія нормы выпрацоўкі выконвалі на 150—180 проц.

Работа на касьбе праводзілася групамі і такім чынам вялася рашучая барацьба з лодырамі.

Зараз калгас падрыхтаваўся да ўборкі збожжавых. Калгасьнікі далі слова выканаць абавязкі па пастаўцы збожжа дзяржаве не пазьней 10 жніўня па ўсіх культурах.

Калгасьнік Я. Крыцкі.

Вынікі самазаспакаеньня.

Толькі 50 проц. пляну сенаўборкі выканаў калгас „Свабода", Старасельскага сельсавету, той калгас, які раней за ўсіх скончыў сяўбу ў раёне.

Калгас ня здолеў замацаваць сваіх перамог атрыманых у часе сяўбы, і перанесьці дадатны вопыт на сенаўборку, якую зараз ганебна правальвае.

У калгасе не наладжана грамадзкае харчаваньне на лугу, з-за чаго касцам прыходзіцца за 3—4 кілёмэтры хадзіць на абед, на што траціцца многа часу. Ясьлі, якія працавалі ў час сяўбы, зараз закрыліся. Старшыня калгасу т. Барысёнак тлумачыць закрыцьцё ясьлей адсутнасьцю прадуктаў, Між тым, калгас адпусьціў на ясьлі 17 пудоў жыта і 50 пудоў бульбы і калгасьнікі ня ведаюць куды падзеўся гэты фонд. Ясьляй няма і таму жанчыны дрэнна ходзяць на работу і таму ўбрана толькі 30 проц. скошанай сенажаці.

Партыйная ячэйка Старасельскага сельсавету на чале з сэкратаром т. Саламонікам ня ведае, чым жыве калгас. Зацікаўцеся ў Саламоніка, як ідзе сенаўборка ў калгасе—ён напэўна адкажа, што добра. Гэта таму, што ён амаль ніколі ня бывае ў калгасе. Як быццам яго не датычыцца пастанова ЦК КП(б)Б аб віцебскай партарганізацыі наконт перабудовы сродкаў работы і наближэньня яе да калгасу, брыгады.

А ячэйцы неабходна аказаць дапамогу калгасу вийсьці з прарыву ў сенаўборцы, тым больш, што час пачынаць ужо ўборку збожжа, абмалот і здачу дзяржаве.

Калгасьнікі і калгасьніцы: Малкінская, Храмцова, В. Касьцюшова, Шыёнак, З. Уголева, В. А. Касьцюшоў, М. Ухаў.

ХОД СЕНАЎБОРКІ ПА РАЁНЕ на 25 ліпеня 1933 г.

Назва сельсаветаў	Натуральн. сенажаці: Проц. скошан.	Натуральн. сенажаці: Проц. убранага ад скошан.	Сеяныя травы: Проц. скошан.	Сеяныя травы: Проц. убранага ад скошан.
Замастоцкі	105,8	83,2	89,4	91,5
Міхалёўскі	103,9	89,7	74,0	97,3
Бабініцкі	98,2	88,2	99,1	86,6
Ялагінскі	93,1	70,3	48,1	100,0
В.-Лётчанскі	90,3	83,6	44,0	83,8
Бараўлянскі	87,8	85,6	71,4	82,8
Рудніцкі	85,5	80,5	40,0	100,0
Шумянскі	81,3	83,7	107,0	97,7
Віцебскі	77,3	91,7	123,6	92,6
Машканскі	76,8	82,2	93,9	94,2
Сялюцкі	76,5	82,3	71,5	95,0
Даўжанскі	71,6	62,4	68,3	100,0
Старасельскі	70,1	72,8	93,5	93,0
Рудакоўскі	66,3	53,6	58,3	83,3
Міхалаёўскі	49,5	89,6	99,0	88,2
Па сэктарах:				
Саўгасы	66,0	87,5	89,9	89,9
Каапгасы	65,7	84,6	80,3	80,2
Калгасы	93,3	83,8	88,9	94,3
Аднаасобнікі	57,0	81,3	17,9	86,2
Разам па раёне:	80,2	83,6	80,9	95,4

Сэктар вучоту гарЗА ШАЛАЕВА.

Ударыць па антымэханізатарскіх настроях праўленцаў калгасу „Бальшавік".

У калгасе «Бальшавік», Віцебскага сельсавету, ня рыхтуюцца да ўборкі.

У калгасе ёсьць пяць малатарань, чатыры веялкі, 2 конных прыводы. Але ніводная з машын не адрамантавана, конныя прыводы зарасьлі травой.

Гэтымі днямі знайшлі поўскладаную малатарню, якая была завінутай і аб існаваньні якой ня ведалі ні МТС, ні сельсавет, ні само праўленьне калгасу. Стрэхі токаў, куды неабходна будзе складаць збожжа, дзіравыя, токі ня прыбраны, зарасьлі травой, у іх многа сьмецьця.

Старшыня калгасу Сысоеў не клапаціцца аб надыходзячай уборачнай. Праўленьне калгасу апартуністычна адносіцца да мэханічнай касьбы збожжавых — „Навошта нам жнеярка, сілы хопіць, сажнём рукамі",—разважаюць члены праўленьня.

Яшчэ дагэтуль у калгасе ня скончана сенаўборка.

МТС павінна праверыць работу праўленьня калгасу, а таксама становішча інвэнтару ў калгасе і лішнія машыны перакінуць туды, дзе іх не хапае. Кіраўніцтва ж калгасу павінна быць умацавана. Калгас «Бальшавік» павінен мець бальшавіцкае праўленьне.

Дзяміданў.

25 ЛІПЕНЯ ПАЧАЎ СВАЮ РАБОТУ ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ ГАРПРАФСАВЕТА.

25 ліпеня роўна а 7 гадз. 05 мінут. увечары ў памяшканьні вялікай залі Палацу працы пачаў сваю работу пашыраны пленум гарпрафсавета разам з прафсаюзным актывам. Прысутнічае звыш 600 чалавек. З паўтарагадзінным дакладам аб задачах прафсаюзаў Віцебшчыны ў зьвязку з пастановамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б выступіў сэкратар гаркому КП(б)Б т. І. Г. ЖУРАЎЛЁЎ, які быў спатканы працяжнымі аплёдысмэнтамі ўсёй залі.

Трэба адзначыць, што з усіх шматлікіх прадстаўнікоў рабочых прадпрыемстваў Віцебска найбольш недыспыплінаванымі зьявіліся дэлегацыі фабрык «Дзьвіна», «КІМ» і К. Цэткін, сярод якіх да канца пасяджэньня, у часе спрэчак была досыць значная і прыкметная «уцечка».

Мы лічым, што прафарганізацыя „Дзьвіны", „КІМ" і фабрыкі імя Цэткін павінны рашуча заклікаць да захаваньня цьвёрдай прафсаюзнай дысцыпліны тую частку сваіх прадстаўнікоў на пленум, якая аказалася ў палоне характэрнай для асобных зьвеньняў віцебскай арганізацыі расхлабанасьці, разьгільдзяйства і безадказных адносін да справы.

ЗА ЖАЛЕЗНУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ КОЖНАГА ЗЬВЯНА ВІЦЕБСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ!

Разьгільдзяі Ігольнікау і Казак сурова пакараны.

„...На аснове жалезнай бальшавіцкай дысцыпліны, у няўхількай барацьбе на два франты, за генэральную лінію партыі, супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі, супроць „левых“ загібаў і прымірэнцаў, на аснове апэрацыйнасьці і канкрэтнасьці ў кіраўніцтве, забясьпечыць поўнае і высокаякаснае выкананьне тых задач, якія пастаўлены перад віцебскай арганізацыяй рашэньнямі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і тым самым вывесьці Віцебшчыну з паласы прарываў на адно з перадавых месц у БССР“.

(З пастановы аб'яднанага пленума ГК і гарКК КП(б)Б).

Зрабіць моцны ўрок.

Рад сыгналаў быў дадзены на старонках газэты «Віцебскі пралетары» аб неабходнасьці грунтоўнай масавай падрыхтоўкі да сходаў, на якіх павінна прайсьці прапрацоўка рашэньняў ЦК УсеКП(б) і бюро ЦК КП(б)Б аб рабоце віцебскай партыйнай арганізацыі.

Аднак, бюро калектыву фабрыкі імя Клары Цэткін не ўсьвядоміла на справе ўсёй палітычнай важнасьці і неабходнасьці бездакладнай мабілізацыі ўсёй масы камуністаў і рабочых на ажыцьцяўленьне гэтых гістарычных для віцебскай арганізацыі рашэньняў партыі.

23 ліпеня быў прызначаны партыйны сход для прапрацоўкі пастаноў ЦК. Роўна а 4 гадзіне 30 мінут на сход павінна было зьявіцца 90 камуністаў і 80 камсамольцаў. Аднак, зьявілася а 5 гадзіне толькі 72 камуністы і 12 камсамольцаў. Праз гадзіну зьявілася яшчэ 9 камуністаў, але адначасова палічылі для сябе магчымым пакінуць сход 5 камсамольцаў. У выніку такой недапушчальнай практыкі скліканьня сходу «на скорую руку», адсутнасьці ўсякай падрыхтоўкі—у залі быў шум, бяганіна, запытаньні: наконт чаго-ж сёньня сход. Парадак дня своечасова не абвешчаны.

Віна за тое, што сход, як непадрыхтаваны, прышлося перанесьці, ў першую чаргу ўскладаецца на бюро калектыва (Жураў, Ханіна, Эстрын, Шульман).

Гэта сьведчыць яшчэ раз аб наяўнасьці безадказнасьці і расхістанасьці партыйнай дысцыпліны ў радзе асобных зьвеньняў арганізацыі і ў першую чаргу сярод часткі партыйнага актыву, які павінен на ўласным прыкладзе ўзначаліць барацьбу за жалезную бальшавіцкую дысцыпліну.

Бюро парткалектыва фабрыкі імя Клары Цэткін павінна зрабіць моцны бальшавіцкі ўрок для ўсёй сваёй далейшай работы, праводзячы яе пад знакам сапраўднай, а не славесна дэкларацыйнай, перабудовы ў напрамку поўнага ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

АЛІЛЮЙШЧЫК ІГОЛЬНІКАЎ ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ З АБВЯШЧЭНЬНЕМ СУРОВАЙ ВЫМОВЫ З ПАПЯРЭДЖАНЬНЕМ.

Пастанова бюро парткалектыву фабрыкі „Прафінтэрн“ ад 25 ліпеня 1933 году.

Бюро парткалектыва лічыць вусім правільнай пастанову бюро гаркома партыі аб адмене партыйнага сходу зьмены «Б» ад 21/VII г. г., як прайшоўшага без усялякай папярэдняй масавай падрыхтоўкі і канстатуе, што з боку т. Ігольнікава былі праяўлены фармальна-бюракратычныя адносіны да забесьпячэньня масавай прапрацоўкі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб віцебскай партыйнай арганізацыі і праяўлена прамое ігнараваньне ўказэньняў гаркому партыі аб тым, што «прапрацоўка пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б павінна прайсьці пад знакам самага шырокага разгортваньня знізу да верху пралетарскай самакрытыкі, падвышэньня клясавага палітычнай пільнасьці кожнага камуніста і яго авангардняй ролі на прадпрыемстве, у сельскай гаспадарцы, выяўленьня і выкрыцьця па імёнах і прозьвішчах канкрэтных носьбітаў, маючыхся ў паасобных зьвеньнях партарганізацыі—сямейнасьці, групаўшчыны, саноўна-барскіх адносін да работы, пад знакам выяўленьня буржуазных перараджэнцаў, бюракратаў, маскуючыхся клясавых ворагаў, выганяючы іх з радоў партыі“ (з пастановы аб'яднанага пленуму віцебскага гаркому і гарКК КП(б)Б).

Партыйная і камсамольская арганізацыі фабрыкі «Прафінтэрн» ня была мабілізавана на бязьлітаснае выкрыцьцё „не зважаючы на асобы“ усіх недахопаў у цэхох, у выніку чаго на праведзеным 21 ліпеня сходзе адсутнічала бальшавіцкая крытыка і самакрытыка і сход па сутнасьці быў праведзены фармальна.

Выходзячы з гэтага, а таксама ўлічваючы, што з боку т. Ігольнікава ня былі прыняты меры да выкананьня пастановы бюро гаркома партыі аб мабілізацыі ў лік «75», бюро парткалектыва пастанаўляе зьняць: тав. Ігольнікава з паста агітмаса бюро калектыву і рэдактара шматтыражкі і абвясьціць тав. Ігольнікаву суровую вымову з папярэджаньнем, перадаўшы матар'ял аб ім камісіі па чыстцы партыі.

Сэкратар калектыва фабрыкі „Прафінтэрн» Памяранец.

АД РЭДАКЦЫІ.

Бальшавікі фабрыкі „Прафінтэрн“ правільна зрабілі, калі вызначылі ПАЎТОРНЫ сход па прапрацоўцы пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б паколькі першапачатковы сход зьмены «Б» (ад 21|VII), скліканы без усялякай папярэдняй масавай падрыхтоўкі, быў палітычна ЗМАЗАН. Зусім таксама правільна зьяўляецца пастанова аб суровым пакараньні алілюйшчыка і разьгільдзяя Ігольнікава. Нас толькі зьдзіўляе чаму бюро партыйнага калектыва фабрыкі «Прафінтэрн» не знайшло ў сабе бальшавіцкай рашучасьці са ўсёй вастрынёю адзначыць і памылку ў сяго бюро парткалектыву ў цэлым, бо адказнасьць за палітычнае змазваньне сходу на зьмене «Б» ні ўякім разе ня можа і не павінна быць зьнята, як з бюро калектыва ў цэлым, так і кожнага члена бюро парткалектыва ў паасобку.

Пралетарская крытыка і самакрытыка павінна быць „не зважаючы на асобы“ і „без абязьлічкі“.

Той факт, што паўторна скліканы сход парткалектыву на якім быў заслухан даклад члену партыі аб мабілізацыі ў лік «75», бюро парткалектыва пастанаўляе зьняць: тав. Ігольнікава з паста агітмаса бюро калектыву і рэдактара шматтыражкі і абвясьціць тав. Ігольнікаву суровую вымову з папярэджаньнем, перадаўшы матар'ял аб ім камісіі па чыстцы партыі.

Сэкратар калектыва фабрыкі „Прафінтэрн» Памяранец.

АД РЭДАКЦЫІ.

Бальшавікі фабрыкі „Прафінтэрн“ правільна зрабілі, калі вызначылі ПАЎТОРНЫ сход па прапрацоўцы пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б паколькі першапачатковы сход зьмены «Б» (ад 21|VII), скліканы без усялякай папярэдняй масавай падрыхтоўкі, быў палітычна ЗМАЗАН. Зусім таксама правільна зьяўляецца пастанова аб суровым пакараньні алілюйшчыка і разьгільдзяя Ігольнікава. Нас толькі зьдзіўляе чаму бюро партыйнага калектыва фабрыкі «Прафінтэрн» не знайшло ў сабе бальшавіцкай рашучасьці са ўсёй вастрынёю адзначыць і памылку ў сяго бюро парткалектыву ў цэлым, бо адказнасьць за палітычнае змазваньне сходу на зьмене «Б» ні ўякім разе ня можа і не павінна быць зьнята, як з бюро калектыва ў цэлым, так і кожнага члена бюро парткалектыва ў паасобку.

Пралетарская крытыка і самакрытыка павінна быць „не зважаючы на асобы“ і „без абязьлічкі“. Пралетарская крытыка і самакрытыка павінна быць прамой, рашучай, „не зважаючы на асобы“ і з ўсім сваім вастрыём накіраванай на барацьбу за прамфінплян, за паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых, на барацьбу за поўнае выкананьне шасьці умоў тав. Сталіна, яго ўказаньняў аб тым, каб зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, усіх калгасьнікаў заможнымі.

АБ ПРАЯВАХ РАСХЛЯБАНАСЬЦІ З БОКУ ЧАСТКІ КАМУНІСТАЎ ФАБРЫКІ ІМЯ ЦЭТКІН.

(Пастанова бюро калектыву фабрыкі).

Заслухаўшы паведамленьне сэкратароў цэхавых ячэек (мотальнага, штопальнага, ЗРК, рамонтнага, вязальнага) аб няўцы часткі камуністаў і камсамольцаў на партсход, у выніку зусім нездавальняючай падрыхтоўкі да сходу, як асабліва з боку бюро парткалектыву, так і з боку цэхячэек (няпоўнае апавяшчэньне ўсіх камуністаў, адсутнасьць своечасовай аб'явы аб абвестцы дню сходу, не апавяшчэньне камсамольцаў і г. д.), што прывяло да неабходнасьці перанесьці партсход, паколькі замест 90 камуністаў зьявілася толькі 72, прычым, з іх 9 чалавек спазьнілася на гадзіну, а з 80 камсамольцаў, зьявілася толькі 12 чалавек.

Выходзячы з гэтага, бюро парткалектыву пастанаўляе:

За няведаньне і недастатковы вучот наліччa камуністаў, якія уваходзяць у склад цэхавой ячэйкі, сэкратару цэхпарт'ячэйкі мотальнага цэху тав. Казак—абвясьціць вымову. Абавязаць усіх сэкратароў ячэек забясьпечыць даклады вучот усіх камуністаў, якія работаюць у цэхах.

Указаць тт: Слуцкай, Папкову і Захараву на тыпова разгільдзяйскія, расхлябанныя адносіны да забесьпячэньня поўнай яўкі камуністаў на сход. Папярэдзіць тт. Слуцкую, Папкова і Захарава, што калі падобныя зьявішчы паўторацца, да гэтых таварышоў будуць прыняты самыя суровыя меры партспагнаньня, як да зрыўшчыкаў жалезнай бальшавіцкай дысцыпліны.

За спазьненьне на сход больш чым на поўгадзіну абвясьціць вымову тт. ХАЛОДНАЙ, КАРЧЭЎСКАЙ, РОСКІНАЙ, ПАПКОВАЙ, ВІРАЎЛЯНСКАЙ І КВЯТОВІЧ.

Прапанаваць сэкратарам парт'ячэек не пазьней 25 ліпеня абгаварыць пытаньне аб тых камуністах, якія не зьявіліся на сход.

Партсход перанесьці на 26 ліпеня, даручыўшы т. Жураву правесьці 25 ліпеня нараду сэкратароў ячэек з актывам па пытаньні аб масавай падрыхтоўцы да сходу.

Прымацаваць членаў бюро парткалектыву да цэхаў для папярэдняй прапрацоўкі рашэньняў ЦК УсеКП(б) і бюро ЦК КП(б)Б аб віцебскай партарганізацыі.

Заслухаць 25 ліпеня даклад сэкратара калектыву БСМ аб прычынах няяўкі камсамольцаў на сход.

Сэкратар парткалектыву Жураў.

Я зразумеў, што перавод мяне ў кандыдаты партыі ня ёсьць пакараньне.

(Ліст у рэдакцыю ад рабочага скурзаводу т. Эпштэйна ў адказ на ліст рабочага т. Разумнага.)

На ліст рабочага нашага заводу т. Разумнага, які быў зьмешчаны на старонках газэты «Віцебскі пралетары» ад 23 ліпеня, я лічу сваім абавязкам неадкладна адгукнуцца.

Пастановай камісіі па чыстцы я, як і т. Разумны, за палітычную малапісьменнасьць пераведзён у кандыдаты партыі.

За два гады майго прабываньня ў партыі, я не аўладаў самымі элемэнтарнымі палітычнымі ведамі, не прапрацаваў статуту і праграмы партыі, не прапрацаваў важнейшых партыйных рашэньняў. Вось чаму на шэраг пытаньняў камісіі па чыстцы я ня змог адказаць.

Зараз я працую ў сушыльным цэху ў тэй-жа брыгадзе, дзе і тав. Разумны. Выконваю я прамфінплян на 130 проц. За добрую ўдарную работу я прэміяван два разы. Першы раз—ботамі, а другі—грашыма ў суме 50 руб. З гэтага боку трэба сказаць, не хвалячыся, я, як камуніст, займаю авангардную ролю на вытворчасьці. Але гэтага мала. Камуніст павінен быць палітычна пісьменным, каб штодзённа весьці ў цэху вялікую палітычна-выхаваўчую работу, каб узначальваць усю масу рабочых.

А вось гэта як раз у мяне і адсутнічае. Зусім правільна адзначае ў сваім лісьце т. Разумны, што перавод нас з членаў у кандыдаты партыі ёсьць не пакараньне, а жаданьне ўсёй партыі дапамагчы нам аўладаць палітычнымі ведамі. Лічу неабходным заявіць, што перавод мяне ў кандыдаты партыі цалкам правільны.

Ужо зараз я пачаў узмоцнена работаць па падняцьці свайго палітычнага ўзроўню. Штодзённа чытаю газэты «Правда», „Зьвязда“, „Віцебскі пралетары“, наведваю палітшколу пры нашым заводзе. Праз друк я жадаю выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва т. Разумнага на лепшае асваеньне палітведаў з тым, каб раней году падрыхтавацца і падаць заяву аб прыёме нас у сапраўдныя члены партыі. Да гэтага я заклікаю і ўсіх тых таварышоў з нашага заводу, якія пераведзены ў кандыдаты

З камуністычным прывітаньнем—рабочы скуранога заводу Эпштэйн.

Аб пляне азімай сяўбы на 1933 год.

У цэнтральным друку за подпісамі тт. Молатава і Мірошнікава апублікавана пастанова Савету народных камісараў Саюзу ССР ад 17 ліпеня 1933 году аб пляне азімай сяўбы на 1933 год.

СНК Саюзу ССР пастанавіў зацьвердзіць плян азімай сяўбы на 1933 г. у саўгасах, калгасах і аднаасобных гаспадарках па рэспубліках, раёнах і вобласьцях (у тысячах га). Па БССР — для ўсіх сэктароў зацьверджаны плян—1260 га. Па калгасах—748, прычым для тых, што абслугоўваюцца МТС—260. Па саўгасах усіх сыстэм—36, з іх па саўгасах Наркамсаўгасу 26,6, Наркамзему 6,74, Цэнтрасаюзу 2,5, іншых саўгасах 0,16, па аднаасобніках 476 тысяч га.

Плян сяўбы азімай пшаніцы па БССР вызначаны для ўсіх сэктароў у памерах 60 тысяч га; па калгасах—47 тысяч (для абслугоўваемых МТС—13 тысяч), саўгасах усіх сыстэм—3 тысячы (Наркамсаўгасаў 1,8, Наркамзему 0,45 і іншых саўгасах 0,75) і па аднаасобніках—10 тысяч га.

СНК устанавіў, што абавязковая пастаўка збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі павінна вытварацца толькі з тэй плошчы, якая будзе засеяна кожным калгасам і аднаасобнай гаспадаркай у межах пляну, зацьверджанага для яго на аснове гэтай пастановы. З плошчы, якая засеяна калгасам ці аднаасобнай гаспадаркай звыш гэтага пляну, абавязковая пастаўка збожжа дзяржаве не вытвараецца.

Мабілізацыя «75»—адна з важнейшых палітычных задач.

Дырэктыва пленума гаркому і гарКК павінна быць неадкладна выканана.

„Падыход“ чыноўнікаў з партбілетам у кішэні.

У пастанове пленуму гаркому аб мабілізацыі 75 камуністаў на сталую работу ў вёсцы і ўказаньні гаркому партыі па гэтым пытаньні зварачваецца выключная ўвага парткалектываў на якасны адбор пасылаемых таварышоў. Павінны быць пасланы лепшыя камуністы, здольныя на бальшавіцку біцца за ажыцьцяўленьне рашэньняў партыі і ўраду.

Між тым, паасобныя калектывы зусім не зварочваюць увагі на якасныя паказальнікі пасылаемага таварыша. Чым іншым, як не апартуністычным роўнадушшам можна тлумачыць той факт, што бюро партыйнага калектыву Белуціля рэкамэндавала ў лік «75» камуніста Бэра—былога дырэктара снабжэньня, які быў зьняты за правал работы і атрымаў партыйнае спагнаньне. Паслухаем па гэтым поваду самага сэкратара т. Аўруціна.

— Бачыце, у нас вельмі абмежаваная колькасьць членаў партыі. Усе заняты, работаюць... А вось Бэр нічога ня робіць, так „з боку прыпёку“, як кажуць. І рашылі мы паслаць яго на работу ў вёску. І далей:

—«Ён агітатар добры,—язык што брытва!».

Такія адносіны да выкананьня важнейшай дырэктывы партыі нельга іначай кваліфікаваць, як антыпартыйнымі. Па такіх адносінах і канкрэтных носьбітах іх трэба ўдарыць самым бязьлітасным чынам.

Прыблізна так, як у Б[illegible]ю, падышлі да вылучэньня та[illegible]шоў у лік „75“ на алейным заводзе. Ня кажучы ўжо аб тым, што кандыдатура для работы на вёсцы падбіралася вельмі доўга і няўважліва (яна не прадстаўлена ў гарком і да гэтага часу), бюро ячэйкі вылучыла нарэшце тав. Краеўскую, малапісьменную, якая не разьбіраецца нават у самых элемэнтарных пытаньнях партыйнага будаўніцтва. «Ды ў ёй-жа нутро савецкае»,—захлёбваецца сэкратар ячэйкі т. Шапіра. З такой прыблізна характарыстыкай рэкамэндавана т. Краеўская.

Трэба урэшце, зразумець, што за таго, ці іншага камуніста, які высоўваецца ячэйкай для работы на вёсцы, поўнасьцю ня [illegible]казнасьць уся ячэйка і ў [illegible]шую чаргу бюро і сэкратар. Партыя не [illegible]церпіць бюракратычных, антыпартыйных адносін асобных «гораўкіраўнікоў» парткалектываў і ячэек да выкананьня яе важнейшых дырэктыў і заданьняў.

І. Б.

Нанесьці руйнуючы ўдар па дробнабуржуазнай распушчанасьці!

23 і 24 ліпеня «Віцебскі пралетары» пісаў аб праяўленьні месьніцтва, недаацэнкі і нават ігнараваньня з боку кіраўнікоў партыйных і камсамольскіх арганізацый панчошнай ф. імя КІМ, швэйнай ф. «Прафінтэрн» і шчоткамбінату важнейшай пастановы аб'яднанага пленуму гаркому і гарКК КП(б)Б аб мабілізацыі 75 камуністаў на сталую работу ў вёску.

24 ліпеня, прачытаўшы газэту, сэкратар парткалектыву фабрыкі імя КІМ тав. Баскін абурыўся.

— Ды гэта-ж няправільна. Я-ж вылучыў двух камуністаў. Газэта, наогул, робіць правільна, калі мабілізуе вакол гэтага грамадзкую думку, але пры чым-жа тут я?

Вінават, выходзіць, не тав. Баскін, а яго сусед.

А 24 ліпеня газэта пісала ўжо не аб камуністах, а аб камсамольцах, якіх калектыў БСМ фабрыкі імя КІМ пры папусьціцельстве таго ж самага тав. Баскіна і супроць-дзейнічаньні дырэктара фабрыкі т. Фрэйдзіна яшчэ ня вылучыў.

А калі тав. Баскін вылучыў камуністаў?

Толькі пасьля таго, як прадстаўнік рэдакцыі быў 22 ліпеня на фабрыцы і гутарыў з ім аб гэтым, і толькі 23, пасьля зьмяшчэньня паказанага матар'ялу ў газэце, на бюро парткалектыву, дзе абгаварвалася пытаньне аб фізкультурным сьвяце, «паміж іншым» было вырашана і гэта пытаньне, і то з вялікімі цяжкасьцямі, бо, як скардзіцца тав. Баскін, у іх «няма людзей». Тав. Баскін лічыць гэтую справу вырашанай і скліканьне бюро для дачы адэнкі той распушчанасьці і недысцыплінаванасьці, якую ён правіў, як кіраўнік парт-арганізацыі, ён лічыць зусім непатрэбным.

Такія адносіны да газэты надалей ня могуць быць дапушчаны. А што датычыцца т. Баскіна, мы спадзяемся, што аб ім скажа сваё аўтарытэтнае слова гарКК КП(б)Б.

А. Іофінаў.

За апартуністычную недаацэнку дырэктывы ГК Варкіну, Гадаскінай і Пярчонку абвешчана вымова.

Бюро парткалектыву фабрыкі „Прафінтэрн“ абгаварыла зьмешчаную ў „Віцебскім пралетары“ ад 23 ліпеня заметку: „Нам патрэбна не алілюйшчына, а справа“ у якой указвалася, што з боку тт.: Варкіна, Гадаскінай і Пярчонка была праяўлена апартуністычная недаацэнка рашэньня пленуму гаркому і гарКК КП(б)Б аб мабілізацыі 75 камуністаў на сталую работу ў вёску.

Адзначыўшы правільнасьць прыведзеных у заметцы фактаў, бюро парткалектыва абвясьціла тт.: ВАРКІНУ, ГАДАСКІНАЙ і ПЯРЧОНКУ вымову і папярэдзіла іх, што ў выпадку паўтарэньня з іх боку вышэйпаказаных адносін да выкананьня дырэктыў партыі, да іх будуць прыняты больш суровыя меры партыйнага ўзьдзейнічаньня.

II зьезд і арганізацыя партыі новага тыпу.

(§ 1 СТАТУТУ).

Да пачатку XX стагодзьдзя разьвіцьцё капіталізму перайшло ў новую стадыю, у стадыю імпэрыялізму. Ужо тады, у пачатку 90-х гадоў, Ленін прыкмячаў прызнакі маканапалістычнага загніваньня капіталізму і называў уладу міжнароднага капіталу „драхлеючай уладай“.

1903—1905 гг. у Расіі былі гадамі падрыхтоўкі насьпеўшай буржуазнай рэвалюцыі. Усюды адчувалася набліжаньне рэвалюцыйнай буры—яе дыханьне. Рэвалюцыя супроць царызму ў Расіі нязьбежна павінна была ўдарыць і па міжнародным імпэрыялізьме, чым вартавым псом і апорай зьяўлялася царскае сама ўладатва. Вось чаму барацьба бальшавікоў за арганізацыю рэвалюцыі, за гегемонію пралетарыяту ў насту паючай буржуазнай рэвалюцыі, каб хутчэй перавесьці яе на рэйкі пралетарскай рэвалюцыі,—з самага пачатку мела міжнароднае значэньне. Гэта барацьба павінна была, як пазказваў Ленін, зрабіць „рускі пралетарыят авангардам міжнароднага рэвалюцыйнага пралетарыяту“.

З II зьезду партыі існуе бальшавізм, як баявая партыя новага тыпу, які прынцыпова адрозьніваецца ад рэфармісцкіх партый II Інтэрнацыяналу. Гэтыя партыі па самай сваёй сутнасьці ня здольны былі весьці пралетарыят да заваяваньня палітычнай улады, да зьвяржэньня капіталізму. Яны сьцьвярджэлі, што пралетарыят як-бы прыйдзе да палітычнага панав'ньня мірным шляхам, атрымаўшы большасьць у парляментах, «не пры дапамозе вінтоўкі, а пры дапамозе выбарчага бюлетэня». Самае разуменьне дыктатуры пралетарыяту ім было варожа.

Далёка невыпадкова, што ні ў адной праграме партыі II інтэрнацыяналу ня было прызнаньня неабходнасьці дыктатуры пралетарыяту для пераходу да сацыялізму.

Праграма партыі, прынятая на II зьезьдзе, прынцыпова адрозьнівалася ад праграмы рэфармісцкіх партый перш за ўсё тым, што ў ёй у якасьці неабходнай умовы сацыяльнай рэвалюцыі была высунута задача дыктатуры пралетарыяту—«заваёва пралетарыятам такой палітычнай улады, якая дазволіць яму падаліць усякае супраціўленьне эксплёататараў».

Але для таго, каб весьці пралетарыят да заваёвы ўлады, патрэбна была згуртаваная, баявая арганізацыя яго авангарду—партыя з яснай праграмай, з цьвёрдай тактыкай, з жалезнай дысцыплінай, з цэнтралізаваным кіраўніцтвам.

„У пралетарыята няма іншай зброі ў барацьбе за ўладу, акрамя арганізацыі,—пісаў Ленін пасьля II зьезду.—Разьмяжоўваемы панаваньнем анархічнай канкурэнцыі ў буржуазным сьвеце, прыдушаны ўлены падняволнай працай на капітал, адкідваемы заўсёды «на дно» поўнага жабрацтва, адзічаньня і выраджэньня, пралетарыят можа стаць і няўзбежна стане непераможнай сілай толькі дзякуючы таму, што ідэйнае аб'яднаньне яго прынцыпамі марксызму замацоўваецца матар'яльным адзінствам арганізацыі, якое згуртоўвае мільёны працоўных у армію рабочай клясы. Перад гэтай арміяй не ўстаіць ні здрахлеўшая ўлада рускага самаўладатва, ні драхлеючая ўлада міжнароднага капіталу“ (том VI, стар. 328 пад крэсьлена намі.—Рэд.).

Ідэйныя і арганізацыйныя асновы бальшавізму, як цэлая палітычная думкі і як палітычная партыі новага тыпу былі закладзены яшчэ старой ленінскай «Искрой», бліскучай крытыкай тэорыі хвасьцізму, тэорыі „стыхійнасьці“ ў рабочым руху, якую даў Ленін у сваёй бясьсьмертнай працы «Что делать?».

Іменна ленінская «Искра» выхавала кадры стойкіх рэвалюцыянэраў, цьвёрдых іскраўцаў, якія і згуртавалісь на II зьезьдзе ў партыю бальшавікоў.

Як вядома, важнейшыя прынцыповыя спрэчкі, якія прывялі пасьля да расколу бальшавікоў і меншавікоў, разгарэліся на II зьезьдзе па арганізацыйным пытаньні, па пара графе першым статуту.

Разглядаючы арганізацыю партыі як зброю ў барацьбе за дыктатуру пралетарыяту, бальшавікі змагаліся за тое, каб гэта зброя была моцнай і добра адточанай. Пралетарскі склад ясная грань між партыйнасьцю і беспартыйнасьцю, жалезная дысцыпліна цэнтралізаванае кіраўніцтва,—вось тыя прынцыпы пабудовы пралетарскай партыі, за якія змагаліся бальшавікі на зьезьдзе, працяг ваючы лінію старой ленінскай «Искры».

А меншавікі, якім была чужой ідэя заваёвы палітычнай улады пралетарыятам, замест моцнай адна роднай баявой арганізацыі авангард да пралетарыяту, хацелі стварыць, бязформенную „партыю“ рэфармісцкага тыпу, якая не закладвала на сваіх членаў ніякіх абавязкаў.

Ленінская фармулёўка § 1 статуту казала: «Членам партыі лічыцца кожны, хто прызнае яе праграму і падтрымлівае партыю, як матар'яльнымі сродкамі, так і асабістым удзелам у адной з партыйных арганізацый“. Як мы бачым, тут Ленін прапануе лічыць членам партыі тых, хто асабіста ўдзельнічае у адной з партыйных арганізацый Значыцца, нясе ўсе абавязацельствы, якія выцякаюць з удзелу ў арганізацыі, бязумоўна падпарадкоўваючыся партыйнай дысцыпліне, актыўна работаючы ў радох арганізацыі.

Па думцы Леніна, партыя разглядаецца, як сума арганізацый, а члены партыі як члены адной з яе арганізацый.

А Мартаў адстойваў фармулёўку § 1 статуту, па якой членам партыі лічыцца кожны, хто „прызнае яе праграму, падтрымлівае партыю матар'яльнымі сродкамі і аказвае ёй рэгулярнае асабістае садзейнічань не пад кіраўніцтвам адной з яе арганізацый“. (Ленін, т. VI, стар. 190).

Гэта расплыўчатая фармулёўка не накладвала на членаў партыі ні якіх абавязацельстваў, ніякай дысцыпліны, не патрабавала асабістага ўдзелу і арганізацыі (што пры ўмовах падпольнай работы было зьвязана з вядомымі цяжкасьцямі, арыштамі, ссылкамі, катаргай і г. д.)

Меншавікі прапанавалі ўвесьці як паказвае т. Сталін, «сыстэму» сама залічэньня ў партыю, „сыстэму“ распаўсюджаньня „годнасьці“ члена партыі на кожнага «прафэсара» і «гімназыста», кожнага „спачуваючага“ і «стачачніка», які падтрымлівае партыю так ці іначай, але які не ўваходзіць і не жадае ўваходзіць ні ў адну з партыйных арганізацый“ («Вопросы ленинизма», стар. 68).

„Сваёй фармулёўкай аб членстве ў партыі бальшавікі хацелі стварыць арганізацыйную ўзду супроць напыву непралетарскіх элемэнтаў у партыю“ (Сталін: «Вопросы ленинизма», стар. 607).

Цікава адзначыць, што гэтае спрачаньне па § 1 статуту, аб членстве ў партыі мела таксама міжнароднае значэньне. Тая фармулёўка, якую адстойваў Мартаў, была вельмі блізка ад азначэньня членства партыі ў рэфармісцкіх партыях II інтэрнацыяналу. У прыватнасьці, § 1 статуту германскай сацыял-дэмакратыі, прыняты на майнцкім зьезьдзе ў 1900 г. гаварыў:

«Прыналежнай да партыі лічыцца кожная асоба, якая прызнае прынцыпы партыйнай праграмы і падтрымлівае партыю доўгі час грашовымі сродкамі».

Як бачым, тут так, як і ў Мартава, не патрабуецца асабісты ўдзел у адной з арганізацый, не патрабуецца падпарадкаваньня партыйнай дысцыпліне Насумненна, што фармулёўка § 1 статуту на II зьезьдзе рабілася Мартавым не без ўплыву статуту германскай сацыял-дэмакратыі.

Ленін з ўсёй рэзкасьцю выступіў супроць фармулёўкі Мартава, якая давала магчымасьць розным балбатунам, «рэвалюцыянэрам фразы» называць сябе членамі партыі і рабіць спробы ўплыву на партыйныя справы.

«Ленш, каб дзесяць работаючых не называлі сябе членамі партыі (сапраўдныя работнікі за чынам не ганяюцца), чым, каб адзін балбатун меў права і магчымасьць быць членам партыі. Вось прынцып, які мне здаецца неабвяржымым і які пры мушае мяне змагацца супроць Мартава»,—казаў Ленін пры абмеркаваньні статуту. (Том VI, стар. 33).

Ленін падкрэсьлівае, што ўсякі член партыі адказны за партыю і партыя адказна за кожнага члена. Іменна таму, што партыя адказна за кожнага свайго члена, яна правярае асабістыя якасьці кожнага таварыша, які жадае ўступіць у партыю, пры дапамозе кандыдацкага стажу, пагэтаму партыя праводзіць і пэрыядычныя чысткі сваіх радоў.

«Без пэрыядычнай чысткі ад хістаючыхся элемэнтаў партыя ня можа ўмацоўвацца» (Сталін).

«Наша задача ахоўваць цьвёрдасьць, вытрыманасьць, чыстату нашай партыі. Мы павінны старацца падняць годнасьць і значэньне члена партыі, вышэй, вышэй і вышэй».—гэты ленінскі прынцып выказаны ім яшчэ на II зьезьдзе (том VI, стар. 33)) партыя няўхільна праводзіць у жыцьцё.

Мы бачым, што патрабаваньне жалезнай дысцыпліны партыя правярала на сваіх членах з самага пачатку свайго існаваньня. У эпоху дыктатуры пралетарыяту гэтае запатрабаваньне ня толькі ня можа быць паслаблена, але набывае яшчэ большае значэньне.

„Хто хоць колькі небудзь паслабляе жалезную дысцыпліну партыі пралетарыяту («сабліва ў часе яго дыктатуры), той фактычна дапамагае буржуазіі супроць пралетарыяту“ (Ленін).

Ідэйная згуртаванасьць, адзінства волі, жалезная дысцыпліна зьяўляецца адной з важнейшых асаблівасьцяй бальшавізму, як партыі новага тыпу. Без гэтых якасьцяй наша партыя не магла б прывесьці да ўлады пралетарыят, не магла быць кіруючай і накіроўваючай сілай ў сыстэме дыктатуры пралетарыяту.

«... Мы кажам усім жадаючым уступіць у партыю: ці гатоў ты надзець хамут бальшавіцкай дысцыпліны? Калі не гатоў, лепш пачакай, бо ўступаючы ў партыю ты ставіш сваю асабістую волю і жыцьцё ў залежнасьць ад волі і лёсу ўсёй партыі» (Л. М. Каганавіч „Как построена ВКП(б)“, стар. 29).

У часе чысткі, партыя бязьлітасна выганяе са сваіх радоў сярод іншых катэгорый чужых і варожых элемэнтаў, людзей, якія парушаюць жалезную дысцыпліну партыі і дзяржавы.

Партыя наша нарадзілася, вырасла, умацавалася ў барацьбе супр тунізмам..“ УсеКП(б) расцвіла і мацнела праз перамаганьне ўнутры партыйных супярэчнасьцяй. Перамаганьне ўнутрыпартыйных розадагласьсяў шляхам барацьбы зьяўляецца законам разьвіцьця нашай партыі“ (Сталін).

Толькі таму, што партыя разграміла ў свой час эканамістаў“, „меншавікоў, ліквідатараў справа і ліквідатараў «зьлева» («адзавістаў»), сацыял-шавіністаў, — пралетарыят здолеў узяць уладу ў Кастрычніку. Толькі таму, што партыя ў пэрыяд барацьбы за пабудову сацыялізму разграміла контррэвалюцыйны троцкізм і агентуру кулацтва—правы ўхіл,—мы дабіліся вялізарнейшых перамог першай пяцігодкі, вырашылі ленінскае пытаньне «хто каго» і ў прамысловасьці, і ў сельскай гаспадарцы, стварылі фундамант сацыялістычнай эканомікі.

Пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна партыя прайшла слаўны 30-гадовы шлях, роўнага якому [illegible] ва ўсёй гісторыі чалавецтва.

Яшчэ больш павышаючы сваю ідэйную згуртаванасьць, яшчэ больш уздымаючы дысцыпліну ў сваіх радох, уздымаючы ўсё вышэй і вышэй годнасьць члена партыі, як актыўнага перадавога барацьбіта за сацыялізм, партыя пад геніяльным кіраўніцтвам т. Сталіна, перабудоўваючы свае рады, прыстасавальна да ўмоў разгорнутага сацыялістычнага наступу, дапаўняючы тэрытарыяльны прынцып пабудовы партыйных арганізацый вытворчым, дабіваецца перамогі другой пяцігодкі і ўрачыстасьці сацыялізму ва ўсім сьвеце. («Правда»).

28 ЛІПЕНЯ—ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ ВІЦЕБСКАГА ГАРСАВЕТУ.

Выпалім алілюйшчыну, парадную шуміху—характэрную для усей работы зьнятага кіраўніцтва гарсавету.

ЗАВОСТРАНАЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ПРЫНЦЫПОВАСЬЦЮ, КАНКРЭТНЫМ АПЭРАЦЫЙНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ, ВЕДАНЬНЕМ ЛЮДЗЕЙ, ЦЯСЬНЕЙШАЙ СУВЯЗЬЗЮ З РАБОЧЫМІ МАСАМІ—ПРАСЯКНЕМ РАБОТУ ГАРСАВЕТУ.

Тав. Жаброўскі—сэкратар ЦК КП(б)Б у сваім дакладзе на аб'яднаным пленуме ГК і гарКК сумесна з Віцебскім партактывам 16 ліпеня падкрэсьліў, што „у Віцебску пышнымі кветкамі працьвіталі бюракратычныя, саноўна-барскія мэтады кіраўніцтва. Практычная штодзённая бальшавіцкая работа, аснованая на непрарыўным арганічным злучэньні высока-прынцыповага ўзроўню з вывучэньнем і глыбокім веданьнем дэталяў, канкрэтная штодзённая бальшавіцкая работа знаходзіла ў загоне. Паглыбляўся ўпартая штодзённая палітычна-гаспадарчая работа падмянялася пісанінай, патокамі рэзалюцый, славеснай дэкларацыйнасьцю і траскучай балбатнёй". Праведзенае нашай брыгадай азнаямленьне з тым, як мінулы склад прэзыдыуму гарсавету займаўся пытаньнямі кіраўніцтва прамысловасьцю, нацкультбудаўніцтвам, рабочым забесьпячэньнем, камунальнай гаспадаркай, работай сярод дэпутатаў—яшчэ раз падцьвярджае ўсю правільнасьць і вялікую палітычную важнасьць тых рашэньняў, якія вынесены ЦК КП(б)Б у сувязі з прарывамі ў веснавой сяўбе і прарывамі ў рабоце Віцебскай прамысловасьці, важнасьць няўхільнага бальшавіцкага выкананьня тых мерапрыемстваў, якія намеціў пленум і КГ гарКК па гэтых рашэньнях.

КІРАЎНІЦТВА „НАОГУЛ І Ў ПРЫВАТНАСЬЦІ", У МІРАВЫХ МАШТАБАХ!

Характэрна, што за час студзень—ліпень гг. амаль за 7 месяцаў прэзыдыум гарсавету ні разу не заслухоўваў аб становішчы выкананьня прамфінпляну на буйнейшых прадпрыемствах гораду. Фабрыка „Сьцяг індустрыялізацыі", завод „Чырвоны мэталіст", фабрыка „Дзьвіна", „КІМ" і інш. зусім выпалі з-пад увагі прэзыдыуму. Прэзыдыум гарсавету на чале з т. Кардашэнка праходзіў міма тых глыбокіх прарываў, з якіх на працягу доўгага часу ня выходзіла прамысловасьць. Аб выкананьні прамфінпляну тымі прадпрыемствамі, якія ўжо заслухоўваліся, (торфзавод, фабрыка гнутай мэблі) прэзыдыумам гарсавету выносіліся агульныя, нікога не абавязваючыя, рэзалюцыі.

Пытаньні барацьбы за паляпшэньне рабочага забесьпячэньня, як адна з важнейшых зьвеньняў пасьпяховай барацьбы за поўнае выкананьне прамфінпляну, выпалі з поля гледжаньня прэзыдыуму. Як і да шэрагу іншых важнейшых пытаньняў, тут была праўлена поўная апартуністычная недаацэнка, саноўна-барскія бюракратычныя адносіны. Характэрна, што прэзыдыум на працягу 7 месяцаў 1933 году ня ставіў на сваіх паседжаньнях пытаньня аб становішчы грамадзкага харчаваньня ня толькі ў разрэзе таго ці іншага прадпрыемства, але нават і буйнейшых прадпрыемстваў. Толькі пытаньнямі аб парадку выдачы наборных дакумантаў і дэцэнтралізаваных загатоўках (наогул) абмежаваўся прэзыдыум па пытаньні рабочага снабжэньня. Ні аб ходзе сяўбы па прыгарадных гаспадарках, ні аб становішчы сталовых ЗРК, ні аб адкормачных пунктах—прэзыдыум не абгаварваў. Нялепш справа і з пытаньнямі камунальнай гаспадаркі. Тут была праўлена такая-ж апартуністычная бесклапотнасьць, як і да рабочага снабжэньня. На паседжаньнях прэзыдыум разьбіраў такія пытаньні, якія маглі вырашацца ў звычайным рабочым парадку (напрыклад: аб ачыстцы вуліц ад сьнегу, аб ачыстцы рынкаў, аб звалачных мясцох і інш.), і якія адцягвалі ўвагу прэзыдыуму гарсавету ад грунтоўнейшых пытаньняў. Пытаньнямі жыльлёвага будаўніцтва, становішчам выкарыстоўваньня маючайся жыллоплошчы і пабудаваных рабочых кватэр становішчам водаправоду, каналізацыі, азеляненьнем рабочых пасёлкаў і вуліц, прэзыдыум не займаўся.

„СЛУХАЛІ, ПАСТАНАВІЛІ"...

Яркім паказчыкам таго, як прэзыдыум займаўся пытаньнямі нацкультбудаўніцтва зьяўляецца той факт, што аддзел нарасьветы фактычна быў прадастаўлены сам сабе. Калі ставілася пытаньне нарасьветы, яно праходзіла на прэзыдыуме фармальна. Так, па пытаньні аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году на дакладзе т. Пячатнікава была вынесена наступная наскрозь алілюйская, абязьлічаная рэзалюцыя: «Заслухаўшы аб падрыхтоўцы да навучальнага году, адзначыць, што будаўніцтва школ у гэтым годзе стаіць пад пагрозай зрыву з прычыны апартуністычных адносін з боку сельсаветаў і загадчыкаў школ і зусім недастатковай пільнасьці з боку гарАНА". І далей пералічваецца рад агульных нікога не абавязваючых, без канкрэтных асоб,—прапаноў. Хто канкрэтна вінаваты ў дрэнным ходзе будаўніцтва па школах, у фактычным зрыве яго—прэзыдыум не адзначыў і не ўсклаў персанальнай адказнасьці за вынішчэньне маючыхся прарываў.

Між тым, такі факт, што будаўніцтва 10-годкі пры фабрыцы «Дзьвіна», якая будуецца ўжо на працягу пяці год і награжае быць нясканчанай і ў гэтым годзе, яскрава гаворыць аб адсутнасьці ўвагі да гэтага важнейшага пытаньня з боку прэзыдыума. Будаўніцтва школы праходзіць яўна па-шкодніцку. Падвал заталены вадой, праз столь працякае вада, якам разбурае будынак, штукатурка, якая зроблена з гліны—ва многіх мясцох адвалілася і нягледзячы на гэта, пытаньне аб будаўніцтве гэтай школы на прэзыдыуме ні разу ня ставілася.

РАБОТА ПРЭЗЫДЫУМУ СЯРОД ДЭПУТАТАЎ... АЛЬБО ТОЕ, ЧАГО НЯ БЫЛО...

Пры гарсавеце было створана 13 сэкцый з агульнай колькасьцю 349 дэпутатаў, з іх рабочых 212, 211 членаў і кандыдатаў партыі і 18 камсамольцаў. Такі склад актыву пры правільным і штодзённым правядзеньні з ім работы з боку прэзыдыуму мог забясьпечыць высокаякасную, сапраўды бальшавіцкую работу Віцебскага гарсавету. Але ж у тым-та і ўся бяда былога кіраўніцтва гарсавета, што яно не разумела і апартуністычна недаацэньвала работу сярод гэтага актыву, апартуністычна недаацэньвала тую ролю, якую павінен адыграць гэты актыў ва ўсёй рабоце гарсавету. Гэта недаацэнка прывяла да адрыву работы прэзыдыуму і значнай часткі аддзелаў гарсавету ад масы дэпутатаў.

Пагардлівыя, саноўна-барскія адносіны Кардашэнкі і іншых членаў прэзыдыуму і загадчыкаў аддзелаў (Жураў, Гельфанд, Шпілёў, Пячатнікаў) да работы сярод актыву прывялі да такога становішча, што вьявязваючае зьвяно прэзыдыуму з масамі—сэкцыі, дэпутацкія групы на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах, за некаторым выключэньнем, не працавалі і такім чынам прэзыдыум і значная частка аддзелаў гарсавету былі да апошняга часу адарваны ад рабочых мас.

Прывядзём некаторыя факты: на працягу паўгода масавы аддзел гарсавету быў без кіраўніка. Работай сэкцый і дэпутацкіх груп фактычна ніхто ня цікавіўся і не кіраваў. Яны былі прадастаўлены самі сабе. На працягу больш году прэзыдыум не заслухаў дакладу аб рабоце ніводнай дэпутацкай групы і толькі фармальна заслухаў тры сэкцыі. У выніку такога „кіраўніцтва" большасьць сэкцый не працавала. З усіх 13 сэкцый працавала толькі 6 (камунальная, вайсковая, аховы здароўя, адміністрацыйная, бытавая і больш-менш нарасьветы), астатнія сэкцыі не працавалі. Такія сэкцыі як сельска-гаспадарчая, транспартная, грашовая, РСІ ня зьбіраліся ў працягу 9—15 месяцаў. Так, транспартная ня зьбіралася з 13 мая 1932 г., сэкцыя РСІ—з 6 кастрычніка 1932 г., грашовая з 8 сакавіка 1933 г., сельска-гаспадарчая з 29 верасьня 1932 г.

Саноўна-барскія мэтады кіраўніцтва мінулага кіруючага складу гарсавету, поўная палітычная недаацэнка работы сэкцый, выразіліся і ў тым, што нават тая, часам каштоўная ініцыятыва, якую праўлялі паасобныя сэкцыі па радзе важнейшых пытаньняў,—ня толькі ня цікавіла прэзыдыум, а прама ігнаравалася ім. Камунальная сэкцыя правяла вялікую работу па распрацоўцы каналізацыі гораду, правядзеньню водаправоду, па паляпшэньні санітарнага абслугоўваньня працоўных мас. У гэту работу былі ўцягнуты масы членаў сэкцый, арганізоўваліся брыгады, але, з прычыны таго, што прапрацаваныя сэкцыяй пытаньні самастойна бяз прэзыдыуму не маглі быць вырашаны, а прэзыдыум гэтымі пытаньнямі не займаўся,—уся праца сэкцыі аказалася дарэмнай і, зразумела, паніжала актыўнасьць членаў сэкцыі па распрацоўцы іншых пытаньняў. Характэрным момантам адрыву ад мас кіруючага складу яшчэ зьяўлялася тое, што загадчыкі аддзелаў праводзілі сваю работу зусім ня ўвязваючы з работай сэкцый,—выключна адміністрацыйным парадкам.

НОВАЕ КІРАЎНІЦТВА ГАРСАВЕТУ ПАВІННА ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ УЗОРНУЮ РАБОТУ ДЭПУТАЦКІХ ГРУП.

З 20 дэпутацкіх груп, якія былі створаны на прадпрыемствах, толькі 6 праводзілі больш-менш сталую работу. Гэта групы: фабрыкі «Прафінтэрн», акулярнай фабрыкі, імя Лекерта, скурзаводу, шчацінна-шчотачнага камбінату і «Прагрэс». Дэпутацкія групы на фабрыцы «Дзьвіна», заводзе «Камінтэрн», фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі», панчошных фабрыках «КІМ» і імя Клары Цэткін, заводзе «Чырвоны мэталіст»—не працавалі, а лічыліся толькі на паперы.

Работай дэпутацкіх груп прэзыдыум таксама ня цікавіцца, як і работай сэкцый гарсавету.

На вёсцы было створана 90 дэпутацкіх груп пры саўгасах і калгасах. Па лічбах быццам і добра, але фактычна большасьць і гэтых дэпутацкіх груп не працавала, бо прэзыдыум ня цікавіўся іх работай таксама, як і дэпутацкімі групамі на прадпрыемствах. Больш таго, былым загадчыкам масавага аддзелу Цукерманам была дадзена палітычна-шкодная ўстаноўка ў рабоце гэтых груп, што кіраўнікамі іх могуць быць і ня члены гарсавету.

Калі да ўсяго гэтага дадаць тое, што дзелавыя пленумы гарсавету на працягу году ня склікаліся, а прызначаемыя пленумы зачастую зрываліся па віне самага прэзыдыуму (прэзыдыум фармулаваў гэтыя зрывы неабходнасьцю „адкласьці"), то стане зусім ясным малюнак адрыву ад мас прэзыдыуму і апарата гарсавету.

Новае кіраўніцтва гарсавету пад кіраўніцтвам гаркому партыі, на аснове пастаноў ЦК КП(б)Б і пленуму гаркому і гарКК, мабілізаваўшы актыўнасьць дэпутатаў гарсавету і ўсёй масы рабочых, калгасьнікаў і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці раёну, павінна забясьпечыць ліквідацыю ўсіх маючыхся прарываў у рабоце гарсавету і вывесьці раён у рады перадавых па БССР.

Брыгада газэты «Віцебскі пралетары»: П. Г. Кубаль (рабочы фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі").
Б. Л. Мэерзон (рэдакцыя «Віцебскага пралетара»).

586 АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПА ЦЬВЁРДАЙ ПАСТАЎЦЫ ЗБОЖЖА І БУЛЬБЫ ЯШЧЭ НЯ ЎРУЧАНЫ АДНААСОБНІКАМ І КАЛГАСЬНІКАМ.

НЕАДКЛАДНА ЎРУЧЫЦЬ УСЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ, ВІНАВАТЫХ У ЗАТРЫМЦЫ ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.

Сёньня-заўтра калгасы і аднаасобнікі пачнуць масавую ўборку авімага жыта, пшаніцы і раньняга ячменю.

Таму зусім зразумела, што на партыйныя ячэйкі і сельсаветы зараз як ніколі кладзецца вялікая адказнасьць за падрыхтоўку і арганізацыю здачы збожжа дзяржаве, за правядзеньне новага закону аб цьвёрдых абавязковых пастаўках.

Аднак рад сельсаветаў праявілі яўную недаацэнку гэтай кампаніі.

Вось, па Рудакоўскім сельсавеце яшчэ не даведзены абавязацельствы па збожжы да 53 аднаасобнікаў і па бульбе—да 44, па Рудніцкаму сельсавету 30 аднаасобнікаў ня маюць на руках абавязацельстваў па збожжы і 20—па бульбе. Ня ўручаны абавязацельствы 17 калгасьнікам па Машканскім сельсавеце. 36 аднаасобнікаў ня маюць у сябе на руках абавязацельстваў: 16 па збожжы і 20 па бульбе.

Усяго па раёне яшчэ ня ўручана і не афармлена абавязацельстваў па абавязковай пастаўцы збожжа 192 і бульбы 207. Ня ўручана 187 абавязацельстваў калгасьнікам па бульбе.

Усё гэта, калі ня прыняць неадкладных мер да хутчэйшага ўручэньня абавязацельстваў і афармленьня іх,—адаб'ецца на своечасовасьці выкананьня плянаў па збожжапастаўках дзяржаве. Здарылася такое становішча толькі таму, што з боку старшынь сельсаветаў (Кербэль—Рудакі, Іваноў—Рудніцы, Астапаў—Машканы) ня была пастаўлена на належную вышыню растлумачальная работа сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў аб новым законе па абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве, не праўлена дастатковай адказнасьці за ўручэньне і афармленьне іх расьпіскай збожжаздатчыкамі.

На сёньняшні дзень яшчэ ня ўсе пасьведчаньні зьвернуты з расьпіскай збожжаздатчыка аб тым, што ён атрымаў абавязацельства на пастаўку збожжа і бульбы. Усяго па раёне недастаўлена пасьведчаньняў у сэктар па загатоўках пры гарсавеце 82 га збожжы і 101 па бульбе з аднаасобнага сэктару, і 198 па бульбе ад калгасьнікаў. Асабліва дрэнна справа стаіць у Рудніцкім сельсавеце, дзе маецца 146 неафармленых абавязацельстваў, Мікалаеўскім—82, Машканскім—39. Усё гэта перашкаджае ўстанавіць правільны вучот уручэньня абавязацельстваў. Ёсьць нават выпадкі казённага падыходу да выпіскі абавязацельстваў. Так у Рудакоўскім сельсавеце толькі зараз выявілася, што тром аднаасобнікам зусім ня былі выпісаны абавязацельствы.

Такое становішча надалей ні ў якім выпадку нецярпіма. Неабходна зараз-жа мабілізаваць усе сілы і сродкі з тым, каб сёньня-заўтра, не пазьней, уручыць кожнаму аднаасобніку, калгасьніку абавязацельствы, афарміць уручэньне расьпіскай.

Партыйныя ячэйкі і сельсаветы абавязаны разгарнуць шырокую масавую работу па распрацоўцы адкрытага ліста калгасу імя Чырвонай арміі, Ялагінскага сельсавету, цесна ўвязаўшы задачу ўборкі ўраджаю з выкананьнем цьвёрдых паставак.

Абавязак кожнага камуніста, члена сельсавета, старшыні калгасу да першага жніўня—арганізаваць першыя чырвоныя абозы з новым хлебам.

С.

ПАДРЫХТОЎКУ ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ—НА РЭЙКІ САЦСПАБОРНІЦТВА!

Час бяжыць, а „Гарбачэўскі толькі мяркуе сёе-тое зрабіць"...

УСЕ КАЛГАСЫ ВІЦЕБСКА ПАВІННЫ ПАДХАПІЦЬ ПАЧЫН КАЛГАСУ „ТРУЖАНІК"

Белпэдтэхнікум неадкладна павінен навярстаць упушчанае.

«Абвешчанае усесаюзнае спаборніцтва дырэктароў навучальных устаноў сапраўды зьяўляецца магутным вагаром у пасьпяховай падрыхтоўцы да новага навучальнага году. Ні адзін дырэктар інстытуту, тэхнікуму не павінен застацца па-за спаборніцтвам. Адразу-ж выпрацаваць канкрэтны плян работы на аснове паказальнікаў спаборніцтва».

(З пастановы апэрацыйнай групы камітэту ўсесаюзнага спаборніцтва ВТНУ, ВПУ і тэхнікумаў пры «Комсомольской Правде»).

Падрыхтоўка да навучальнага году па віцебскім Белпэдтэхнікуме пад яўнай пагрозай зрыву. Нягледзячы на тое, што да пачатку навучаньня застаўся зусім кароткі час, дырэкцыя тэхнікуму на чале з тав. Гарбачэўскім і прафарганізацыя справай вярбоўкі студэнцтва амаль не займаюцца. У выніку гэтага на 21 ліпеня атрымана толькі 157 заяў, а павінна быць прынята ў гэтым годзе 340 студэнтаў. З агульнай колькасьці заяў толькі 6 ад рабочых і 50 проц. ад калгасьнікаў. Пасланыя ў маі вярбовачныя брыгады па раёнах не далі колькі-небудзь рэальных вынікаў, на прадпрыемствах таксама не праведзена масавай работы сярод рабочай моладзі, аддзель і [illegible]кая назначная колькасьць заяў [illegible] рабочых.

Ня лепш абстаіць справа з падрыхтоўкай інтэрнатаў. Інтэрнатамі павінна быць забясьпечана 400 студэнтаў, а маецца жыллоплошчы толькі на 200. Дзе будзе разьмешчана астатняя колькасьць студэнтаў? Ні дырэкцыя, ні прафарганізацыя, ні камгас гарсавету аб гэтым ня турбуюцца. Адпушчаны будынак тэхнікуму на 40 чалавек не адрамантаваны. На запытаньне ў Гарбачэўскага, што ім зроблена, каб атрымаць грошы на рамонт, а таксама забясьпечыць астатнюю колькасьць студэнтаў памяшканьнем, ён спакойна адказвае: „Нічога. Ня будзе інтэрнату, прыдзецца студэнтаў адаслаць да хаты". Дрэнна таксама з навучальнымі плянамі. Наркамасьветы ўсё абяцае прысласць гэтыя пляны, але-ж пакуль што абяцаньні застаюцца толькі на паперы. Габінэты пры тэхнікуме, за выключэньнем вайсковага, не абсталяваны і тут дырэктарам тав. Гарбачэўскім абсалютна нічога ня робіцца. Абвешчанае ўсесаюзнае спаборніцтва дырэктароў ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў на лепшую падрыхтоўку да навучальнага году да гэтае пары не знайшло яшчэ водгуку ні сярод адміністрацыі, ні прафарганізацыі тэхнікуму. «Мы мяркуем што-небудзь зрабіць ў гэтым напрамку»—кажа т. Гарбачэўскі. Такім чынам, замест баявой падрыхтоўкі да навучальнага году, тав. Гарбачэўскі толькі мяркуе сёе-тое зрабіць.

Парт'ячэйка працасьветы і аддзел нарасьветы гарсавету на чале з тав. Пячатнікавым да гэтага часу не цікавіліся, як тэхнікум рыхтуецца да навучальнага году, фармальна агаварваючыся, што «тэхнікум яшчэ не ў нашым веданьні».

Пара ўзарваць гэту апартуністычную заспакоенасьць і бястурботнасьць ў справе падрыхтоўкі да новага навучальнага году. Парт'ячэйка і аддзел нарасьветы, дырэктар тэхнікуму і прафарганізацыя павінны забясьпечыць своечасовае выкананьне сур'ёзнейшай задачы, пастаўленай партыяй, і арганізавана сустрэць навучальны год.

Я-ч.

Па-бальшавіцку сустрэць новы навучальны год.

Самаабавязацельства дырэктара віцебскага пэдінстытуту т. Чарнецкага.

Поўным ходам распачаць навучальны год першага верасьня і ні на аўзін дзень пазьней—так пастаўлена партыяй задача.

Ажыцьцяўленьне гэтай задачы патрабуе разгорнутай бальшавіцкай падрыхтоўкі да навучальнага году, арганізаванага і апэрацыйнага кіраўніцтва гэтай падрыхтоўкай з боку кіраўнікоў навучальных устаноў.

У адказ на ініцыятыву дырэктароў маскоўскай прамакадэміі т. Каменскага і маскоўскага энэргетычнага інстытуту тав. Дудкіна па абвяшчэньні ўсесаюзнага конкурсу дырэктароў ВТНУ, ВПУ і тэхнікумаў на лепшую падрыхтоўку да навучальнага году, я ўключаюся ў конкурс і бяру на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Поўнасьцю выканаць заданьне НКА аб наборы ў інстытут 300 чалавек студэнтаў, ажыцьцяўляючы гэту задачу арганізаваным шляхам; а) замацаваньнем за інстытутам 50 чалавек выпускнікоў з вэтрабфаку; б) падрыхтоўкай праз сыстэму курсаў 80 чалавек; в) астатнюю колькасьць шляхам арганізаванай вярбоўкі на мясцох, накіраваўшы для гэтай справы ў буйнейшыя гарады і раёны БССР 5 адказных працаўнікоў. Для прэміяваньня лепшых вярбоўшчыкаў стварэем прэміяльны фонд у суме 1000 рублёў; г) арганізаваць у інстытуце сталую штодзённую кансультацыю па пытаньні набору і перыядычныя кансультацыі на прадпрыемствах гораду Віцебску; д) ня больш як у двухдзённы тэрмін даваць пісьмовыя адказы на паступаючыя заявы і лісты аб прыёме.

2. Арганізаваць, па сталаму раскладу правесьці іспыты ў інстытут, забясьпечыўшы паступаючых на час іспытаў інтэрнатам і сталовай.

3. Склясьці навучальныя пляны для ўсіх аддзяленьняў і накіраваць на зацьверджаньне ДВС не пазьней 1 жніўня. Дабіцца таго, каб не пазьней як да 25 жніўня гэтыя пляны былі зацьверджаны, а таксама—праграмы. Не пазьней як да 5 верасьня давесьці пляны і праграмы да кожнага студэнта.

4. Забясьпечыць інстытут падручнікамі.

5. Да 20 жніўня скласьці сталы расклад заняткаў на тры месяцы. Да 20 жніўня папоўніць катэдры кваліфікаванымі навуковымі працаўнікамі: а) катэдру матэматыкі—прафэсарам, загадчыкам катэдры; б) катэдру хіміі—дацэнтам; в) катэдру біялёгіі—дацэнтам; г) катэдру пэдагогікі і пэдалёгіі — загадчыкам катэдры; д) катэдру эканомікі—дацэнтам.

6. Забясьпечыць запрошаных навуковых працаўнікоў жыльлёвай плошчай.

7. Да 20 жніўня падрыхтаваць поўнасьцю навучальную плошчу, закончыўшы рамонт, разьмеркаваць па катэдрах, забясьпечыць лябараторыі і габінэты вучэбным і гаспадарчым абсталяваньнем.

8. Да 1 верасьня закончыць пабудову інтэрнату на 400 асоб, мабілізаваўшы 200 чалавек студэнтаў для дапамогі будаўнічай арганізацыі ў правядзеньні работ. Абсталяваць інтэрнат неабходнай мэбляй.

9. Арганізаваць у новым інтэрнаце чытальню, пакой адпачынку для студэнтаў.

10. Дабіцца перад ЦРК больш хуткай арганізацыі студэнцкай кампаніі для пэдустаноў гораду Віцебска і водпуску для гэтых устаноў памяшканьня пад сталовую.

11. Арганізаваць пры сталоўцы сьвіварнік.

12. Падрыхтаваць памяшканьне для захаваньня бульбы і гародніны на зіму.

13. Выклікаю на спаборніцтва ДВС, які павінен, каб не сарваць спаборніцтва дырэктароў, своечасова зацьвердзіць і даслаць вучэбныя пляны. Выклікаю ўсіх дырэктароў тэхнікумаў, рабфакаў гораду Віцебска ўключыцца ва ўсесаюзнае спаборніцтва з тым, каб да 1 верасьня забясьпечыць поўную падрыхтоўку да навучальнага году.

14. Падтрымоўваю унесеную намі раней шую прапанову аб арганізацыі гарадзкога спаборніцтва па падрыхтоўцы да навучальнага году, з уключэньнем у гэтае спаборніцтва ня толькі навучальных устаноў, але іншых арганізацый, ад якіх залежыць падрыхтоўка да навучальнага году. У прыватнасьці, выклікаю віцебскі ЦРК уключыцца ў спаборніцтва па арганізацыі студэнцкага кампэратыву. Выклікаю таксама ўключыцца ў спаборніцтва загадчыка віцебскім вучасткам Белкамунбудтрасту тав. Асінаўскага, ад якога залежыць своечасовае наканчэньне інтэрнату інстытуту.

Прашу рэдакцыю газэты «Віцебскі пралетары» узяць на сябе арганізацыю і арбітраж гарадзкога спаборніцтва навучальных і гаспадарчых устаноў на баявую, сапраўды бальшавіцкую падрыхтоўку да навучальнага году.

Дырэктар пэдінстытуту ЧАРНЕЦКІ.

АД РЭДАКЦЫІ.

Рэдакцыя газэты „Віцебскі пралетары" падтрымоўвае каштоўную прапанову тав. ЧАРНЕЦКАГА па арганізацыі спаборніцтва дырэктароў ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў Віцебшчыны на лепшую падрыхтоўку да навучальнага году, а таксама падкрэсьлівае неабходнасьць уключэньня ў гэта спаборніцтва ўсіх тых арганізацый, ад якіх залежыць добраякасная падрыхтоўка да навучальнага году. У сваю чаргу рэдакцыя лічыць неабходным уключэньне ў гэта спаборніцтва фабрык, заводаў, саўгасаў і калгасаў Віцебшчыны і заклікае ўсю пралетарскую грамадзкасьць раёну прыняць актыўны ўдзел ў гэтым спаборніцтве.

Рэдакцыя газэты сумесна з гаркомам камсамолу і праўленьнем саюзу працасьветы 31 ліпеня склікаюць па гэтым пытаньні спэцыяльную нараду.

Выклікаем усе калгасы Віцебшчыны.

Калгас «Тружанік», улічваючы важнасьць дапамогі школе ў правядзеньні ўсеагульнага навучаньня і своечасовай і поўнай падрыхтоўцы да навучальнага году, уключаецца ва ўсесаюзны агляд гатоўнасьці да новага навучальнага году і бярэ на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Для дапамогі ШКМ у арганізацыі гарачых сьнеданьняў вылучыць палову бульбы. Для ўтрыманьня каня, які патрэбен школе для таго, каб прывазіць і адвозіць дзяцей у зімовы час—вылучыць палову сенакосу, 0,25 га буракоў і іншай гародніны.

2. Для забясьпячэньня школы апалам загатовіць і вывезьці 10 к. м. дроў.

На лепшую дапамогу школе калгас „Тружанік" выклікае на соцспаборніцтва калгасы «1 мая», «Новае жыцьцё», „Свабода", „Другая пяцігодка", а таксама ўсе калгасы Віцебшчыны.

Па даручэньні калгасьнікаў, старшыня калгасу Голік.

ДЭЛЕГАЦЫЯ ПІЯНЭРАЎ БІРА-БІДЖАНА НА ФАБРЫКАХ І ЗАВОДАХ ВІЦЕБСКА.

Зь апошнія дні піянэрдэлегацыя Біра Біджана дэталёва азнаёмілася з усімі працэсамі буйнейшых прадпрыемстваў, як фабрыкі—«Сьцяг індустрыялізацыі», імя КІМ, акулярнай, заводу „Чырвоны мэталіст" і інш. У час абедзеннага перапынку ў сталовых і па цэхах гэтых прадпрыемстваў адбыліся мітынгі рабочых, прысьвечаныя прыезду гасьцей — піянэраў-ударнікаў вучобы Біра-Біджана.

Дэлегацыя расказала рабочым, як вырас і замацаваўся сацыялістычны Біра-Біджан, яна азнаёміла рабочых, як рабочыя швэйнай фабрыкі „Эмэс" і заводу «Кола рэвалюцыі» змагаліся за выкананьне прамфінпляну—за аўладаньне тэхнікай і за якасьць прадукцыі, як Біра-Біджанскі раён завяршыў па-бальшавіцку сяўбу і прыступіў да праполкі і падрыхтоўкі да ўборкі.

Дэлегат Каваль (прыехаўшы ў Біра-Біджан з ПАЗШ) расказаў рабочым, як паглыбляецца эканамічны крызіс у Амэрыцы, як вырасла 14-мільённая армія беспрацоўных, як рабочыя пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі змагаюцца з буржуазіяй за вызваленьне і чаму ён са сваімі бацькамі два гады таму назад прыехаў у СССР, у Біра-Біджанскі раён. Ён расказаў, як піянэрыя Амэрыкі змагаецца за рабочую справу, нягледзячы на пабоі, гумавыя дубінкі і турмы. Ён расказаў, як піянэрыя СССР і піянэрарганізацыя Біра-Біджанскага раёну прымаюць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве.

У спрэчках выступіла многа рабочых, якія адзначылі посьпехі ленінскай нацыянальнай палітыкі, перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Яны абяцалі шляхам узмацненьня АЗЭТ работы аказваць штодзённую дапамогу сацыялістычнаму Біра-Біджану. Рабочы калектыў „Сьцяга індустрыялізацыі" абавязаўся ўзяць шэфства над швэйнай фабрыкай «Эмэс».

Г. Б.

ЗА ГРАНІЦАЙ.

Францускі друк устрывожан узбраеньнямі Германіі.

ПАРЫЖ. «Журналь» у артыкуле аб таемных узбраеньнях Германіі, заяўляе, што Германія, ня выконваючы ваенных артыкулаў вэрсальскага дагавору павялічыла сваю армію і аснасьціла яе забароненымі відамі ўзбраеньня. Вакол рэйхсвэру цесна групуюцца ваенізаваныя арганізацыі, якія налічваюць у Германіі прыблізна 1 млн. членаў. Кавалерыйскія эскадроны, наперакор забароне забясьпечаны кулямётамі. Рэйхсвэр забясьпечан 210 мм. гарматамі і гусенічнымі танкамі. Не паказваючы гэтых танкаў на манэўрах, рэйхсвэр карыстаецца імі ў сакрэтных ваенных практыкаваньнях.

Далей газэта ўказвае, што ў Германіі вядзецца вялікая работа па матарызацыі артылерыі.

Ваенізаваныя арганізацыі складаюцца з маладых людзей ва ўзросьце ад 18 да 25 год, большасьць якіх арганізавана ў штурмавых атрадах. Арганізацыі налічваюць 600—800 тысяч чалавек.

БІРЖАВАЯ ПАНІКА Ў ПАЗШ ПАШЫРАЕЦЦА.

Н'Ю-ЁРК. Хлебныя біржы ў Чыкага і іншых цэнтрах сёньня заставаліся закрытымі. Другія харчовыя біржы таксама закрыліся. Фондавая біржа ў Н'ю-Ёрку, пачынаючы з 24 ліпеня, будзе адкрывацца толькі ў 12 гадз., а ня ў 10 гадз., як да гэтага часу. Такім чынам, час функцыянавньня біржы скарачаецца на дзьве гадзіны.

ВОСТРЫЯ РЭПРЭСІІ СУПРОЦЬ НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТАЎ У АЎСТРЫІ.

ВЕНА. Арыштован належачы да тэрарыстычнай арганізацыі германскіх нацыянал-сацыялістаў граф Альвэнс Лебэн, які прыбыў у Аўстрыю з фальшывым пашпартам, зробленым, паводле вестак аўстрыйскага друку, ў афіцыяльных германскіх установах. У афіцыяльным паведамленьні гаворыцца, што Альвэнс Лебэн—віноўнік нядаўняга замаху на кіраўніка Тырольскай арганізацыі хэймвэру Стэйдле і падрыхтоўваў тэрарыстычны акт супроць аўстрыйскага міністра бясьпечнасьці Фэя.

Выдан надзвычайны дэкрэт аб узмацненьні цэнзуры і паліцэйскага нагляду за работай друкарань. Выдавец нацыянал-сацыялісцкіх газэт пазбаўлен дазволу на выдавецкую дзейнасьць.

Саюз уладальнікаў друкарань, нежадаючы рызыкаваць матар'яльна, нарашыў спыніць друкаваньне нацыянал-сацыялісцкіх газэт. Гэтыя газэты ня выходзяць. Забаронена таксама пашырэньне нацыянал-сацыялісцкай літаратуры, продаж музычных твораў, накшталт гімну германскіх нацыянал-сацыялістаў—«Хэрс-Вэсэль», адкрытак і партрэтаў Гітлера і іншых кіраўнікоў германскіх нацыянал-сацыялістаў.

Напружанае становішча на аўстрагерманскай граніцы.

БЭРЛІН. «Бэрлінэр Бэрзэнцэйтунг» паведамляе аб канцэнтрацыі аўстрыйскіх войск каля германскай граніцы. Атрад альпійскіх стралкоў які знаходзіўся ў Ліндэ, пераведзен у Шэрдынг. У Зальцбург накіраван атрад стралкоў з Нейзэдэля. У Куфштэйне размешчан атрад альпійскіх стралкоў з Халя. Па словах газэты, гэтыя меры зьвязаны з тым, што штурмавыя атрады неаднаразова пераходзілі граніцу з Баварыі ў Аўстрыю.

ВІЦЕБСКІ ДЗЕНЬ.

— 12 сталовак і 5 гарбатняў для сплаўшыкаў адчынена сплаўканторай на час сплаўных работ 1933 году. Прапускная здольнасьць гэтых сталовак—звыш 2000 асоб. Кошт абеду зьніжаны да 50 60 кап.

— Рабочыя ф-кі імя Лекерта 20 ліпеня пашла ў адпачынак. Фабком разгарнуў палітвыхаваўчую работу ў час адпачынку. 23 ліпеня адбылося масавае катаньне на лодках на р. Віцьбе, дзе была праведзена здача норм на значок ГПА па лет ніх відах.

— У сувязі з падрыхтоўкай да перш га жніўня, ячэйка МОПР трамвая поўнасьцю ліквідавала запазычанасьць па членскіх узносах. На сёньняшні дзень паступіла 400 рублёў. Працягваецца збор членскіх узносаў за чацьвёрты квартал. 1 жніўня ячэйка МОПР праводзіць паліта соўку на лодках, прысьвечаную міжнароднаму чырвонаму дню.

УРАДЖАЮ ГАРОДНІНЫ І БУЛЬБЫ—БАЯВУЮ СУСТРЭЧУ.

ВУЧЫЦЕСЯ Ў РАБОЧЫХ АКУЛЯРНАЙ ЎДАРНАМУ ЗМАГАНЬНЮ ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ У КААПГАСЕ.

Ад чорнай дошкі да чырвонага сьцягу.

(Артыкул рабочых акулярнай фабрыкі БАРАНОЎСКАЙ Л., ДАВІДАВА, КАНАПЛЕВА Е. і рабочых-ударнікаў каапгасу фабрыкі—САКАЛОЎСКАГА і ІВАНОЎСКАГА).

Наш каапгас «Новы сьвет» (акулярнай фабрыкі) раней адставаў (асабліва ў час першай праполкі). Прычыны адставаньня крыліся ў нашай уласнай неарганізаванасьці, у тым, што фабрычныя арганізацыі не дапамагалі каапгасу, за што наш каапгас у свой час быў занесены на чорную дошку.

Пагражаючае становішча, калі гародніна зарастала пустазельлем, прымусіла ўзварушыць увесь рабочы калектыў і фабрычныя арганізацыі. Была накіравана ў каапгас сталая брыгада з лепшых ударнікаў. Яны перанесьлі ўдарныя прыклады сваёй работы ад варштатаў на каапгасныя палі. У выніку—наш каапгас 14 ліпеня скончыў другую праполку, гэтымі днямі канчаем Грэцкую. 20 ліпеня быў выканан плян сенаўборкі.

Мы жадаем расказаць усёй пралетарскай грамадзкасьці гораду аб нашай барацьбе за ўраджай, за паляпшэньне рабочага снабжэньня. Сталая брыгада Бараноўскай сваім перавыкананьнем норм у каапгасе дабілася своечасовай і лепшай якасьці. Ударныя прыклады работы ў гэтай брыгадзе паказваюць Бараноўская Арына, Кузьняцова Зіна і жонка рабочага Хадарэнка. Сенакашэньне праведзена выключна сіламі рабочых фабрыкі. Рабочы Калесьнікаў узначаліў брыгаду касцоў, якія паказалі сапраўды гераічныя прыклады работы, бо яны разумелі, што страціць дзень, страціць гадзіну—гэта значыць страціць дзесяткі цэнтнераў сена. Лепш за ўсіх ў брыгадзе Калесьнікава працавалі касцы Лазараў, Шыракоў, Шостак.

Чым тлумачацца нашы посьпехі ў праполцы гародніны і ўборцы сена?

Рабочы калектыў добра разумее, што прыгарадная гаспадарка—гэта галоўны цэх фабрыкі, ад работы якога ў значнай ступені залежыць паляпшэньне снабжэньня, што мы самі нясём адказнасьць за сваю прыгарадную гаспадарку. Кожны цэх у нас шэфствуе над пэўнай культурай і клапоціцца, каб яна не зарастала пустазельлем. Цэх ведае становішча праполкі сваёй падшэфнай культуры.

Арганізаваней сталі выходзіць рабочыя на праполку. Вось для прыкладу возьмем 24 ліпеня (выходны дзень). З фабрыкі ў гэты дзень прышло 230 чалавек. Яны былі разьмеркаваны па вучастках, ім былі даны заданьні. Як правіла, на праполку з усімі рабочымі выходзіць і дырэктар фабрыкі Галуза, Цэл—сэкратар парткалектыву, Сергеенка—загадчык аддзелам вытворчасьці, Мэерзон—галоўны мэханік, Шарленка — галоўны бухгальтар. Яны з матыкаю ў руках, разам з рабочымі, паказваюць ўзорныя прыклады як трэба змагацца з пустазельлем. За 24 ліпеня рабочыя фабрыкі прапалолі 3 га бульбы, 1 га кармовых буракоў, 1 га столовых буракоў, 0,5 га цыбулі Лепшыя гераічныя прыклады работы на полі паказалі ў брыгадзе Мэерзона рабочыя—Караськоў, Бэрзін, Хадарэнка, Дзямішкевіч, Давідаў, Шапіра, Фамін (намесьнік дырэктара), у брыгадзе Самцовай (брыгадзір гаспадарча разрахунковай брыгады падрыхтоўчага цэху) ударна працавалі Ярышка, Булаўская, Ленкунова, Рамашава, Фрышман, у брыгадзе Старажылец (шліфавальны цэх) лепш за ўсіх працавалі Барадаўская і Каваленка. Вось па гэтых ўдарніках і трэба трымаць раўненьне. Іх прозьвішчы павінны ведаць усе. Гэта яны, ударніки варштату—ударнікі высокага ўраджаю.

Але нельга прайсьці міма фактаў уласнай нашай неарганізаванасьці, расхлябанасьці і разгільдзяйства. Вось ЗРК не павярнуўся тварам да каапгасу. Старшыня ЗРК т. Дворкін ня бывае ў каапгасе: ЗРК ня турбуецца каб у час масавых выхадаў у поле быў буфэт, вада і г. д.

Таксама нядобрасумленна працавалі на полі 24 ліпеня рабочыя фабрыкі Бэрліна, Эпштэйн, Салямонава, Гайдук, Лерман і Перавозміна (падрыхтоўчы цэх). Дызэртырвалі ў гэты дзень, пасьля абеду Блашэвіч (падрыхтоўчы цэх) Княчко, Шалыт, Сямёнава М., Сямёнава С., Кнаўніцкі (шліфавальны цэх), Шульман, Астраўлянскі, Сарокін (мэханічны цэх). Гэта яны, зрыўшчыкі рабочага снабжэньня, гэта яны жадаюць уцягнуць наш каапгас у прарыў. Вакол гэтых канкрэтных носьбітаў зла ўзьнімем нашу пралетарскую ярасьць, дадзім рашучы адпор малейшым спробам дызэртырства і іншаўдарніцтва.

Цяпер некалькі слоў аб нашым ураджаі. Мы атрымаем у гэтым годзе багаты і добры ўраджай, асабліва бульбы Наш багаты ўраджай дае нам поўную ўпэўненасьць у тым, што мы з гонарам выканаем лёзунг т. Сталіна, зробім 1933 год апошнім годам дзяжасьцяй. І мы гэты ўраджай ахоўваем, як зяніцу вока. У гаспадарцы 8 вартаўнікоў і кожную ноч з фабрыкі прыходзіць для аховы палёў дадаткова па 18—20 чалавек.

Зараз на фабрыцы разгарнулася падрыхтоўка да харчовай канфэрэнцыі па пытаньнях уборкі. На гэтай канфэрэнцыі мы ўсебакова, дэталёва абгаворым становішча гатоўнасьці фабрыкі да ўборкі і хаваньня гародніны і бульбы.

За нашы посьпехі мы атрымалі чырвоны сьцяг гарпрафсавету і рэдакцыі «Віцебскага пралетара». Перад пралетарскай грамадзкасьцю гораду мы, ад імя ўсіх рабочых фабрыкі, заяўляем, што пераходны сьцяг мы не здамо і што з гэтым чырвоным сьцягам мы, замацоўваючы нашы перамогі, бязьлітасна змагаючыся з «галавакружэньнем ад посьпехаў», зазнаваньствам, расхлябанасьцю і разгільдзяйствам,—у нашым каапгасе ўзорна, бяз страт, правядзем уборку.

Аб рабоце міжраённых саўпартшкол.

Пастанова ЦК КП(б)Б.

1. Паставіць задачай перад саўпартшколамі падрыхтоўку кіруючых работнікаў для нізавых партыйных і камсамольскіх арганізацый, калгасаў, саўгасаў і МТС (сэкратары ячэек, прапагандысты, старшыні калгасаў, брыгадзіры і інш.) у адпаведнасьці з тымі павышанымі запатрабаваньнямі, якія прад'яўляюцца кіруючаму работніку на вёсцы сучасным этапам сацыялістычнага будаўніцтва.

2. У мэтах павышэньня якасьці падрыхтоўкі нізавых кадраў арганізаваць па ўсіх саўпартшколах (за выключэньнем магілёўскай, якая рыхтуе савецкія кадры) наступныя аддзяленьні:

а) партаддзяленьне з 2-х гадовым тэрмінам навучаньня, на якім рыхтаваць сэкратароў калгасных, саўгасных і МТС ячэек КП(б)Б, нізавых прапагандыстаў і агітатараў;

б) калгаснае аддзяленьне з 1-гадовым тэрмінам навучаньня, на падрыхтоўцы старшынь калгасаў, брыгадзіраў жывёлагадоўчых таварных фэрм і інш.;

в) камсамольскае аддзяленьне з 1-гадовым тэрмінам навучаньня па падрыхтоўцы сэкратароў ячэек ЛКСМБ у саўгасах, калгасах і МТС і прапаработнікаў для камсамольскай сеткі і палітасьветы.

3. Умовы прыёму на асобныя аддзяленьні ўстанавіць наступныя:

а) на 2-гадовае—прымаць членаў КП(б)Б, якія падрыхтаваны ў абёме пачатковай партшколы, умеюць чытаць, пісаць і ведаюць чатыры дзеі арытмэтыкі;

б) на калгаснае аддзяленьне прымаць членаў і кандыдатаў КП(б)Б, спачуваючых, камсамольцаў і беспартыйных рабочых і калгасьнікаў (да 25 проц.) з актыўнай сяўбенкай, калгаснай грамадзкай работы, якія ўмеюць пісаць, чытаць і лічыць у абёме чатырох дзей арытмэтыкі;

в) на камсамольскае аддзяленьне прымаюцца члены і кандыдаты КП(б)Б, камсамольцы з 3-гадовым камсамольскім стажам. Да прыёму дапусьціць таварышоў па падрыхтаванасьці ў абёме камсамольскай пачатковай школы і 4-х годкі, ва ўзросьце ня вышэй 20 год.

4. Кантынгент набору на 1933—34 навучальны год зацьвердзіць:

а) па віцебскай саўпартшколе:
2-гадовае аддзяленьне—30 чал.;
калгаснае аднагадовае аддзяленьне 60 чал.;
камсамольскае аддзяленьне 30 чал.;

б) па гомельскай саўпартшколе:
2-х гадовае аддзяленьне 60 ч.;
калгаснае аднагадовае аддз. 60 ч.;
камсамольскае аддзяленьне 30 ч.

У гомельскай саўпартшколе на 2-х гадовым аддзяленьні арганізаваць прапгрупу па падрыхтоўцы штатных прапагандыстаў РК КП(б)Б, у якую прымаць членаў КП(б)Б з 2-х гадовым партстажам, з актыўнай парт. і грамадзкай работай, падрыхтаваных у абёме ВСПШ і чатырох годкі;

в) па менскай саўпартшколе:
2-х гадовае аддзяленьне 30 ч.;
калгаснае 1-гадовае аддзял. 60 ч.;
камсамольскае аддзяленьне 30 ч.

г) У магілёўскую саўпартшколу прыняць 120 чал., ўсяго 520 чалавек.

Даручыць культпропу ЦК КП(б)Б даць разьвёрстку раёнам па камплектаваньні, выходзячы з прынцыпу прымацаваньня да саўпартшкол асобных вытворчых зон БССР (ільнавод чая зона, бульбяна жывёлагадоўчая і бульбяна-канапляводчая).

5. Для правядзеньня набору арганізаваць пры саўпартшколах мандатныя камісіі ў складзе пралетаў ніка ГК, РК КП(б)Б, ГК РК КСМ і школы. Усю адборачную работу скончыць не пазьней 1 верасьня 1933 г. Заняткі па СПШ распачаць з 1-га кастрычніка 1933 г. Кіраўніцтву саўпартшкол распрацаваць і распаўсюдзіць матар'ялы для падрыхтоўкі да іспытаў паступаючых на вучобу. Абавязаць РК КП(б)Б і ЛКСМБ арганізаваць для камандируемых падрыхтоўку да прыёмачных іспытаў.

6. Прапанаваць культпропу ЦК і Наркамасьветы (ДВС) пераглядзець навучальныя пляны і праграмы саўпартшкол і да пачатку заняткаў забясьпечыць апошнімі ўсе саўпартшколы па асобных дысцыплінах. Распрацаваць праграмы па спэцяльных дысцыплінах пытаньняў сельскай гаспадаркі (лён, жывёла гадоўля, збожжавыя культуры, бульба, арганізацыя працы ў буйной сельскай гаспадарцы).

7. Устанавіць на СПШ канцэнтраваную практыку—на 2-гадовым аддзяленьні на працягу 2-х месяцаў, на 1-гадовым у працэсе вучобы ў прыгарадных калгасах, саўгасах і МТС.

Устанавіць па саўпартшколах перапынны навучальны год з 15-дзённым перапынкам зімой і паўтарамесячным—летам.

8 Прапанаваць Наркамасьветы сваячасова ўкамплектаваць саўпартшколы патрэбнымі педкадрамі, прычым асноўныя дысцыпліны забясьпечыць выкладчыкамі, падрыхтаванымі ў абёме асыстэнтаў. Узмацніць навучальную дысцыпліну і якасьць выкладаньня. Арганізаваць [illegible] вую работу прадметных [illegible]й. НКА распрацаваць м'ятадычны [illegible]ст для саўпартшкол аб мэтадах выкладаньня, прыстасоўна да тэй падрыхтаванасьці і аддзяленьняў, якія арганізуюцца па саўпартшколах.

9. Даручыць Саўнаркому забясьпечыць менскую саўпартшколу па трэбнай навучальнай жыльлёвай плошчай да 1 жніўня.

10. Прапанаваць загадчыкам саўпартшкол арганізаваць пры апошніх сваю ўласную гаспадарку (сталоўка, прыгарадныя гароды, сьвіныя фэрмы і інш.), скарыстаўшы цалкам асигнаваныя НКА на гэту мэту сродкі.

РАЗЬВЁРСТКА па камплектаваньні міжраённых саўпартшкол БССР.

2-х гад, аддзял. Калгаснае.

№№ п-т.	РАЁН.	Арган. Прап.	Камун.	Б п.	Камсамол.	УСЯГО.
	ВІЦЕБСКАЯ СПШ.					
1	Асьвея	2	3	2	2	9
2	Дрыса	2	3	2	2	9
3	Расоны	1	2	1	2	6
4	Полапак	4	4	3	4	15
5	Вушачы	2	3	2	2	9
6	Лепель	3	3	2	3	11
7	Чашнікі	2	2	1	2	8
8	Талачын	2	2	2	2	7
9	Сянно	2	3	2	2	9
10	Крупкі	2	2	1	2	7
11	Бялынічы	2	2	2	2	8
12	Гарадок	3	3	2	3	11
13	Сураж	2	2	1	2	7
14	Сіроціна	2	2	1	2	7
15	Лёзна	2	2	1	2	7
16	Бешанковічы	2	2	1	2	7
17	Луброўна	3	4	2	4	13
18	Горкі	2	2	1	2	7
19	Шклоў	3	4	2	5	14
20	Чэрвусы	1	2	1	2	6
21	Мсьціслаўе	2	3	2	2	9
22	Віцебск	10	7	2	10	29
23	Ворша	5	5	2	5	17

Неадкладна ліквідаваць прарыў па сенаўборцы.

У каапгасе фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» — «Новы шлях», дрэнна ідзе сенаўборка. Каля 50% скошанага сена ляжыць нявораным. Тут як і для праполкі, фабком неарганізавана дасылае рабочых. Вось, 10 ліпеня прышлі рабочыя з фабрыкі без усялякага кіраўніцтва. Фабкомам ня былі вызначаны адказныя асобы за работу дасланых рабочых. Частка з іх дызэртыравала з поля. Так, пакінулі работу работніцы: Філер, Чумакова, Восіпава, Іванова П. Я., Воўкава, Коткіна, Іазафатава, Гаспадоўская і Зярнова.

Не зразумелі гэтыя работніцы, што кожны страчаны дзень—гэта ўдар па сенаўборцы, што іх дызэртырства з работы—удар па рабочым снабжэньні. Фабком фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» павінен прыняць меры, каб неадкладна завяршыць у каапгасе сенаўборку.

Рабкораўскі пост «Віцебскага пралетара»: Грунтоў Курыленка.

Каапгас імя Молатава выканаў плян сенаўборкі.

Каапгас заводу «Чырвоны мэталіст» імя Молатава 23 ліпеня да 11 гадз. ўвечары завяршыў плян сенаўборкі. Скошана і ўбрана 58 га сена—звыш пляну скошана 5 га, убрана 3 га. Сенаўборка ў гэтым годзе ў гаспадарцы скончана на 40 дзён раней, чым у мінулым.

Рабкораўскі пост—Юдзін.

Шкоднікі гнояць канюшыну.

На палёх каапгасу «МОПР» з 2 ліпеня ляжыць каля 30 гектараў скошанай і нявобранай канюшыны.

Згрэблянае коннымі граблямі канюшына дрэнна складзена. Большасьць яе напсавалася. Па грубых падліках каапгас губляе 7500 пудоў канюшыны—самага каштоўнага корму.

Гэта трэба расцэньваць як яўнае шкодніцтва з боку кіраўніцтва каапгасу «МОПР» на чале з дырэктарам ШЫЛЬНІКАВЫМ.

Справа павінна быць тэрмінова расьсьледвана і ўсе шкоднікі прыцягнуты да суровейшай адказнасьці.

Мядзьведзеў.

28 ліпеня, а 6 гадз увеч., у памяшканьні 2-га Беларускага тэатру адкрываецца

ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ ВІЦЕБСКАГА ГАРАДЗКОГА САВЕТУ.

На абвестцы дню:

1. Пастанова ЦК КП(б)Б аб кіраўніцтве віцебскага гарсавету і далейшыя задачы гарсавету.

2. Арганізацыйныя пытаньні.

На пленум у абавязковым парадку павінны зьявіцца члены і кандыдаты гарадзкога савету, а таксама кіраўнікі прадпрыемстваў устаноў і арганізацый.

29 ліпеня, а 6 й гадзіне ўвечары, у садзе імя Леніна адбудзецца

НАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ ГАРКОМУ ЛКСМБ СУМЕСНА З АКТЫВАМ

Абвестка дню:

1. Даклад сэкратара гаркома КП(б)Б тав. І. Г. Жураўлева аб рашэньнях ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб віцебскай партыйнай арганізацыі.

2. Аб масавай рабоце сярод дзяўчат.

3. Аб правядзеньні ў Віцебску ўсебеларускага фізкультурна-воднага сьвята.

4. Арганізацыйныя пытаньні.

Сёньня павінны быць прадстаўлены сьпісы ў гарком КСМ аб удзельніках пленуму.

— Сёньня, 27 ліпеня а 7 гадз увечары ў памяшканьні РСІ (пакой № 12) адбудзецца ПЛЕНУМ СЭК ЦЫ РСІ ГАРСАВЕТУ.

БЮРО СЭКЦЫІ.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

З 30 га ліпеня 15 ГАСТРОЛЯЙ З 30 га ліпеня

Дзяржаўнага яўрэйскага тэатру БССР.

Мастацкі кіраўнік—заслужаны артыст рэспублікі М. Ф. РАФАЛЬСКІ.

683—3—1

ВІЦЕБСКАЯ ВОПЫТНА-ПАКАЗАЛЬНАЯ ШКОЛА ШОФЭРАЎ абвяшчае набор студэнтаў да 1 жніўня з адрывам ад вытворчасьці 35 чал. і без адрыву ад вытворчасьці 30 чал.

Пры паступленьні неабходны дакументы: даведка аб сацыяльным становішчы, даведка аб сацыяльным паходжаньні, аб нараджэньні, аб адукацыі.

Канцылярыя школы (Аршанская, 43) адчынена з 9 да 16 гадзін.

675—2—2

АБУТКОВЫ МАГАЗЫН № 7 КААПГАНДЛЮ даводзіць да ведама заказчыкаў па індывідуальных заказах на абутак, што АПОШНІ ТЭРМІН ВЫКУПУ АБУТКУ 1 ЖНІЎНЯ. У выпадку невыкупу, ўсе заказы будуць прададзены. ПАСЬЛЯ ПАКАЗАНАГА ТЭРМІНУ НІЯКІЯ ПРЭТЭНЗІІ ПРЫМАЦЦА НЯ БУДУЦЬ.

677—2—1

Даводзіцца да ведама, што СКЛАД ШЫРОКАГА СПАЖЫВАНЬНЯ БЕЛПРАМБУДКЕРАМСАЮЗУ ЛІКВІДУЕЦЦА.

672—1—1

ВІЦЕБСКІ ЛЕСПРАМГАС даводзіць ДА ВЕДАМА КІРАЎНІКОЎ ГАСПАДАРЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ГОРАДУ І РАЁНАЎ, САЎГАСАЎ І КАЛГАСАЎ, што ў лясных дачах леспрамгасу МАЮЦЦА ДЛЯ ПРОДАЖУ РОЗНЫЯ НЕЛІКВІДНЫЯ ЛЕСАМАТАР'ЯЛЫ. Па пытаньнях атрыманьня лесматар'ялаў зацікаўленыя арганізацыі могуць звяртацца ў віцебскі леспрамгас 8-я Сьвярдлова, д. № 6 альбо па тэлефоне № 30.

681—1—1

Кіраўніцтва віцебскага трамвая АТРЫМЛІВАЕ ад пасажыр ў РАД ПРАПАНОЎ, а таксама СКАРГАЎ на паасобных працаўнікоў трамвая. Пры гэтым некаторыя грамадзяне НЯЯСНА ЎКАЗВАЮЦЬ СВАЕ ПРОЗЬВІШЧЫ І АДРАСЫ, чым пазбаўляюць кіраўніцтва магчымасьці даць ім непасрэдна адказ па сутнасьці скаргі.

Кіраўніцтва трамвая просіць надалей усіх падаючых такія заявы, адтак паказваць свае прозьвішчы і адрасы.

679—3—1

ЛЁД ПРАДАЕЦЦА ўсім установам і працоўным з дастаўкай спажыўцу.

Адрас: СТАНЦЫЯ ВІЦЕБСК, ХЛАДАТРАНСПАРТ. Чыгуначны тэлефон 62.

674—2—1

ПОЛАЦКІ ЛЕСАТЭХНІКУМ абвяшчае АСЕНЬНІ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ на 1-шы курс лесазагатоўчага і лесагаспадарчага аддзяленьняў тэхнікуму і 1-шы курс леспрамгасвучу.

Прымаюцца ў тэхнікум асобы, якія скончылі 7 годку, з іспытамі, а ў леспрамгасвуч—з адукацыяй ня ніжэй 5-ці груп сямігодкі.

Узрост паступаючых у тэхнікум ад 16 да 30 год і ў леспрамгасвуч—ад 16 да 20 год. ПРЫЁМ ЗАЯЎ ПРАЦЯГВАЕЦЦА ДА 5 ЖНІЎНЯ. Да заяў неабходна прыкласьці наступныя дакументы: 1) матрычны выпіс з прад'яўленьнем пашпарту (па прыезьдзе на іспыты), 2) аб адукацыі, 3) аб сацыяльным паходжаньні і матар'яльным становішчы сямсога і бацькоў зараз, 4) для адзасобнікаў—акладны ліст за 1932—33 год, 5) даведку аб здароўі, 6) анкету, засьведчаную адпаведнымі органамі, 7) копію вайсковага дакументу, 8) дзьве фотакарткі і на 40 кап. паштовых марак.

ІСПЫТЫ БУДУЦЬ УТВАРАЦЦА для паступаючых у тэхнікум З 15 ПА 20 ЖНІЎНЯ па наступных прадметах: грамадазнаўстве, беларускай мове і літаратуры, матэматыцы, фізыцы і хіміі ў абёме 7-годкі.

Прынятыя забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй у залежнасьці ад пасьпяховасьці ад 30 руб. і вышэй.

Усе залічаныя ў леспрамгасвуч атрымоўваюць зарплату ад 30 да 80 руб., згодна калумовы.

ЗАНЯТКІ ў тэхнікуме і ў леспрамгасвучы ПАЧЫНАЮЦЦА З 1 ВЕРАСЬНЯ. Тэрмін навучаньня ў тэхнікуме 3½ гады і ў леспрамгасвучы 2 гады. 533—3—1

КВАТЭРУ Ў ВІЦЕБСКУ з двух пакояў МЯНЮЮ НА такую-ж у МЕНСКУ. З прапановамі зьвяртацца ў Віцебску, ў кантору „Віцебскага пралетара", тэл. 72, у Менску—Інтэрнацыянальная 6, кв. 6, Энцін. 678—3—2

Адміністрацыя, мясцком і ўвесь калектыў Віцебскага аддзяленьня САЮЗХЛОПКАЗБЫТУ з вялікім жалем паведамляюць аб врадчаснай сьмерці працаўніка аддзяленьня

тав. ЗАБЕЖЫНСКАГА А. Б.,

пасьледаваўшай у ноч на 26 ліпеня г. г. і выказваюць глыбокае спачуваньне сям'і нябошчыка.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ФОТА-ТАПАГРАФІЧНЫ ТЭХНІКУМ СЫСТЭМЫ НКЦП СССР абвяшчае асенні набор студэнтаў на 1-ы курс тэхнікуму на аддзяленьні: фота-тапаграфічнае—60 чал., трыангуляцыйнае—30 чал., картаграфічнае—30 чал. і аддзяленьне арганізацыі тэрыторыі — 60 чал. Тэхнікум рыхтуе: тэхнікаў, фота-тапографаў, тэхнікаў-трыангулятараў, тэхнікаў картографаў і тэхнікаў-арганізатараў тэрыторыі.

У тэхнікум прымаюцца асобы не маладзей 16 год і не старэй 30 год. Для ўсіх паступаючых абавязковы прыёмныя іспыты па прадметах (па праграмах 7-мігадовых школ)—матэматыцы, фізыцы, хіміі, грамадазнаўстве і роднай мове.

Заявы з дакумантамі прымаюцца да 15 жніўня 33 г., а з 15 жніўня па 1 верасьня 1933 г. вытвараюцца іспыты. Пачатак заняткаў з 1 верасьня 1933 г. Да заяў прыкладаюцца дакументы ў арыгіналах: 1) аб адукацыі, 2) даведка аб нараджэньні, 3) аб сацыяльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, 4) аб здароўі, 5) адносіны да вайсковай службы, 6) анкета, засьведчаная дзяржустановамі альбо прафорганамі, 7) дзьве засьведчаныя фотакарткі і марак на 40 к.

Студэнты тэхнікуму забясьпечваюцца інтэрнатам, сталоўкай і стыпэндыяй, згодна пастановы СНК СССР.

Тэрмін навучаньня ў тэхнікуме 4 гады. Заявы з дакумантамі накіроўваць па адрасе: г. Горкі, БССР, фота-тапаграфічны тэхнікум 630—2

ВІЦЕБСКІ РАБФАК ПРЫ ЖЕНСКІМ ІНСТЫТУЦЕ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ АБВЯШЧАЕ прыём на ўсе курсы на 1933—34 навучальны год.

На 1, 2, 3 і 4 ы выпускны курс вячэрняга рабфаку прымаюцца рабочыя безадрыву ад вытворчасьці, а таксама калгаснікі і чырвонаармейцы. На 1 курсе будзе зьменная група. Утвараецца прыём таксама на 4 паралельны дзённы курс.

На Пралетарска-слабадзкі філіял (Маркаўшчына) заявы прымаюцца непасрэдна ў канцылярыі фабрычна-завадзкой 10-годкі. Заявы з заверанай анкетай і даведкай аб месцы працы дасылаць на імя рабфака: Ленінская 30. Анкеты і ўсе даведкі аб прыёме можна атрымаць у канцылярыі. Іспыты адбудуцца з 3 па 12 верасьня.

628—8—4

АРЦЕЛЬ „Калектыўная праца" Белпрамхарчсаюзу, якая знаходзіцца на М Жорэса, 6-ПАВЕДАМЛЯЕ ўсе ўстановы, што ЕЮ ПРЫМАЮЦЦА Ў пераапрацоўку рознага роду каўбасныя вырабы, цукеркі, павідла і ўсякая гародніна, розныя пшанічныя вырабы з сыравіны заказчыкаў.

Прадукцыя выпускаецца вышэйшай якасьці. Умовы просьба заключыць у 10 дзённы тэрмін.

672—2—1

Адказны рэдактар А М КУРЦІК.

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Адказны рэдактар—57; сэкратарыят—1—73; сэктары: с.-г., лістоў рабочых і калгаснікаў, бюро расьсьледваньня, савецкага будаўніцтва, партыйны, вытворчы, снабжэньня і каапэрацыі, нацыянальна-культурнага будаўніцтва—6—15; кантора, аддзел абвестак, машыннае бюро—72; начная рэдакцыя (друкарня)—4—56.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ: г. Віцебск, пляц Волі Палац працы, 3 паверх.

Гарлит № 12. Друкарня „Камінтэрн", Вальшавіцкая, 10.